ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 73 (2126)
9 верасня 1966 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 нап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ЗА ВЯЛІКІЯ ЗАСЛУГІ

Цэнтральны Камітэт КПСС і Савет Міністраў СССР горача павіншавалі з шасцідзесяцігоддзем члена Палітбюро ЦК КПСС, сакратара ЦК КПСС Андрэя Паўлавіча Кірыленку і пажадалі яму доўгіх год жыцця, добрага здароўя і далейшай плённай работы на карысць савецкага народа, у імя перамогі камунізма ў нашай краіне.

За вялікія заслугі перад Камуністычнай партыяй і Савецкай дзяржавай і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прысвоіў тав. Кірыленку А. П. званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем яму ордэна Леніна і залатога медаля «Серп і Молат».

НІШТО НЕ ЗАБЫТА, НІХТО НЕ ЗАБЫТЫ

Учора ў Маскве пачаўся II Усесаюзны злёт пераможцаў паходу па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа.

У сталіцу Савецкага Саюза з'ехаліся 5 тысяч маладых чырвоных следапытаў з усіх рэспублік, краёў і абласцей. Яны падвядуць вынікі ўсесаюзнага паходу па месцах бацькоўскай славы.

Гэтым пяці тысячам, што прайшлі па дарогах Радзімы, ёсць пра што расказаць. Бо кожная пядзя нашай зямлі паліта крывёю герояў, бо кожны горад, кожная вёска, кожны завод — месца, дзе нібы ў фокусе сканцэнтравалася воля, розум, самаадданасць савецкага чалавека.

Сярод пераможцаў Усесаюзнага злёту многа пасланцоў і беларускай моладзі. У Маскве яны раскажуць пра тое, што турысцкія сцежкі ў рэспубліцы прайшлі па 600 маршрутах; што факел эстафеты неўміручай славы бацькоў па дарогах рэспублікі пранеслі больш як 350 тысяч матацыклістаў, лыжнікаў, удзельнікаў мастацкай самадзейнасці, камсамольскіх прапагандыстаў; што за час другога этапу ўсесаюзнага паходу ў рэспубліцы адкрыты 471 музей і 2046 куткоў баявой славы савецкага народа; што толькі за апошнія месяцы на вуліцах гарадоў і вёсак, па памятных месц устаноўлена 1 091 мемарыяльная дошка, на плошчах і ля шасэйных дарог сталі помнікі Герою Савецкага Саюза Феадосію Смалячкову, камсамольцам - падпольшчыкам «Асінторфа», абаронцам Магілёва і многім іншым.

Так, наша моладзь будзе трымаць справаздачу на злёце з горда ўзнятымі галовамі. Яна свята беражэ і захоўвае памяць герояў, вучыцца ў іх подзвігу, мужнасці, працавітасці, ідэйнай перакананасці. Яна свята беражэ традыцыі бацькоў, якія пакрылі сябе неўміручай славай.

11 ВЕРАСНЯ — ДЗЕНЬ ТАНКІСТА

Пра танкістаў складзена шмат песень. І спяваецца ў іх пра мужнасць і адвагу, пра дружбу простых хлопцаў, што вялі ў смяротны бой грозныя машыны, закутыя ў браню. Вялі ў бой і выходзілі пераможцамі.

І сёння ў многіх гарадах Радзімы, што зведалі ў свой час фашысцкую навалу, на высокіх пастаментах стаяць танкі — сімвалы перамогі.

Здымак, які вы бачыце,—не з часоў Вялікай Айчыннай вайны. Ён зроблены цяпер. І танкісты, што выйшлі з машыны ў час кароткага прывалу, ведаюць пра мінулую вайну толькі з кніг, кінафільмаў ды апавяданняў старэйшых.

Але хлопцы ў танкашлемах старанна берагуць баявыя традыцыі бацькоў і сваімі штодзённымі справамі, баявой вывучкай, майстэрствам імкнуцца быць вартымі тых, хто заслужыў сабе на палях вайны неўміручую славу.

...Праз некалькі хвілін скончыцца прывал. Зараве магутны матор, і машына рушыць уперад. Яшчэ адзін дзень баявой вучобы.

Фота П. ДЗЮБІНА.

Надзённае, неадкладнае

АДКЛАД НЕ ІДЗЕ Ў ЛАД

У нашай рэспубліцы працуе шырока разгалінаваная сетка ўстаноў культуры. Толькі дзяржаўных клубаў, дамоў культуры і бібліятэк налічваецца звыш шасці тысяч, а ёсць яшчэ культасветустановы прафсаюзаў і іншых ведамстваў. Яны праводзяць вялікую работу па камуністычнаму выхаванню працоўных.

Зайдзіце ў Кіраўскі сельскі клуб Слуцкага раёна. Гэта — сапраўдны культурны цэнтр калгаса «Першае мая». У ім заўсёды чыста, утульна, будынак старанна дагледжаны. Або Любчанская пасялковая бібліятэка, што на Гродзеншчыне. Яна вабіць да сябе не толькі багатым кніжным фондам, але і сваім вонкавым выглядам. Дом, у якім знаходзіцца бібліятэка,—адзін з лепшых у гарадскім пасёлку.

Рост культуры савецкага чалавека патрабуе ад работнікаў культасветустаноў, органаў культуры і мясцовых Саветаў павысіць адказнасць за работу кожнага клуба, бібліятэкі, Дома культуры. Інакш глядзяць цяпер на культуру і кіраўнікі калгасаў і саўгасаў.

— У нашых калгасах клопаты пра культуру такія ж, як і пра хлеб, мяса і малако, — гаворыць загадчык Слуцкага раённага аддзела культуры Ул. Пасько. — Пад асабістым кантролем старшыні калгаса імя Кірава Сяргея Дзмітравіча Лямешчанкі адбываўся капітальны рамонт клубаў у вёсках Агароднікі і Бліжнія Бандары. Цяпер у кожным з гэтых клубаў будуць бібліятэка з чытальнай, глядзельная і танцавальная залы. Закончан рамонт Палаца культуры на цэнтральнай сядзібе калгаса ў Казловічах.

Дбаюць пра свае клубы калгасы «Расія», імя Калініна, «Памяць Ільіча», «Прамень камуны», «Першае мая» і іншыя гаспадаркі Слуцкага раёна.

Ды ці мала такіх прыкладаў можна знайсці і на Віцебшчыне, і на Гродзеншчыне, і ў іншых абласцях рэспублікі.

Цяпер адна з баявых задач — падрыхтоўка культасветустаноў да работы ў зімовых умовах. У многіх раёнах гэтая работа вядзецца арганізавана, прадумана. У Брагінскім, Слуцкім, Талачынскім раёнах перайшлі на цэнтралізаванае забеспячэнне клубаў, бібліятэк, дамоў культуры палівам. У трох раёнах Гомельшчыны — Рагачоўскім, Рэчыцкім і Брагінскім — ужо добрая палавіна клубаў пераведзена на паравое ацяпленне. На Віцебшчыне, як і ў мінулыя гады, актыўны ўдзел у падрыхтоўцы культасветустаноў да зімы прымае грамадскасць. Напрыклад, у Талачынскім раёне праведзены нядзельнік па вывазцы брыкету. У гэты дзень торфабрыкетны завод адпускаў паліва толькі ўстановам культуры. За адзін гэты нядзельнік было завезена паліва больш чым у палавіну ўстаноў культуры.

У Расонскім, Лепельскім, Дубровенскім і іншых раёнах Віцебскай вобласці распачалося ўручэнне пашпартоў гатоўнасці культасветустаноў да зімы. Камісіі папярэдне правяраюць, як той ці іншы клуб ці бібліятэка гатовы працаваць у зімовых умовах. Калі ўсё зроблена як след, установе культуры ўручаецца пашпарт, які падпісваецца старшынёй сельсавета, загадчыкам раённага аддзела культуры і сакратаром райкома камсамола. Такія пашпарты ўжо ўручаны больш чым палавіне клубаў і бібліятэк.

На жаль, і сёлета даводзіцца гаварыць аб тым, што не ўсюды ўстановы культуры акружаны клопатамі. Трывожнае становішча ў Лагойскім, Любанскім, Буда-Кашалёўскім, Лідскім раёнах. Тут з году ў год у многіх клубах і бібліятэках халадней, як на вуліцы. Яны не адрамантаваны, не забяспечаны палівам і практычна выбываюць са строю. Зімовыя «канікулы» у такіх выпадках цягнуцца чатыры-пяць месяцаў. На такі доўгі час фактычна спыняецца культурна-масавая работа сярод насельніцтва. Мала знойдзецца ахвотнікаў хадзіць зімою ў Рэчаньскую бібліятэку і ў Жалаўскі сельскі клуб Любанскага раёна. Будынкі гэтых устаноў культуры даўно патрабуюць капітальнага рамонту. Ні калгас імя Суворава, ні саўгас «Любанскі» пакуль яшчэ рамонт не пачыналі.

Пра абыякавыя адносіны да элементарных патрэб нашых устаноў культуры сведчыць і такі факт. Ёсць у Добрушскім раёне калгас «Рассвет». Гэта гаспадарка, грашовы прыбытак якой перавысіў мільён рублёў. І вось у гэтым калгасе самыя дрэнныя клубы ў раёне (а іх тут пяць). У Марозаўскім клубе цячэ дах, згніла падлога, вокны не зашклёны. Тое ж у Бярозаўскім і іншых клубах. Рамантаваць іх яшчэ не пачыналі, паліва не завезена. Старшыня калгаса Г. Дударэў лічыць, што культура — не яго клопат, няхай, маўляў, аб гэтым дбаюць сельскі Савет і аддзел культуры.

Адрамантаваць клуб, завезці паліва—гэта тое неабходнае, што трэба рабіць неадкладна. Але, калі мы абмяжуем свае клопаты толькі гэтым, нашым установам культуры будзе, яшчэ многага неставаць.

У клуб людзі прыходзяць адпачыць, задаволіць свае эстэтычныя і культурныя запатрабаванні. Што будуць рабіць, напрыклад, у Доме культуры самадзейныя артысты, калі ў ім няма музычных інструментаў? Патрэбны нашым клубам фотаапараты, эпідыяскопы, магнітолы, розны спартыўны інвентар...

Важна таксама забяспечыць установы культуры мэбляй. Гэтую праблему па-гаспадарску вырашаюць у Магілёве. Тут большасць бібліятэк горада абсталявана тыпавой і зручнай для карыстання мэбляй. Стэлажы, стэнды-вітрыны, сталы эканамічныя і прыгожыя. Пэўную настойлівасць у гэтым праявілі і талачынскія работнікі культуры. Сёлета ў 13 клубаў завезены новыя тэатральныя крэслы, і цяпер з 25 сельскіх клубаў 18 абсталяваны новай мэбляй.

А наогул набыць для клуба, бібліятэкі крэслы, шафы, стэлажы ў нас нялёгка. Час ужо мець у кожнай вобласці рэспублікі спецыялізаванае прадпрыемства па вырабу мэблі для культасветустаноў. Вопыт магіляўчан, якія здолелі арганізаваць у сябе выраб прыгожага і зручнага абсталявання для бібліятэк, варты шырокага пераймання.

На двары—восень. Да зімовых халадоў трэба прывесці ў парадак літаральна кожны клуб, бібліятэку, Дом культуры, каб яны неслі людзям радасць, узбагачалі іх ведамі, далучалі да вялікага свету мастацтва.

Чалавек — тэхніка — прыгажосць

НЕ МАСТАК-АДЗІНОЧКА — КАЛЕКТЫЎ!

Артыкул, надрукаваны ў газеце «Літаратура і мастацтва», «Чалавек—тэхніка—прыгажосць» побач з пастаноўкай рада праблем тэхнічнай эстэтыкі, арганізацыі гэтай справы ў нашай рэспубліцы ўскрывае і сур'ёзныя недахопы ў арганізацыі мастацкага канструявання прамысловых вырабаў і ў першую чаргу прадметаў бытавога прызначэння.

Аўтары артыкула слушна адзначаюць, што нашы інжынеры, ствараючы новыя рэчы, павінны працаваць у цесным кантакце з мастакамі, што да голасу мастакоў павінны прыслухоўвацца кіруючыя органы. Усё гэта правільна. Пытанне даўно наспела, і яго трэба вырашыць. Але па якім шляху трэба пайсці, вырашаючы яго? Аўтары артыкула заяўляюць прама: на нашы прадпрыемствы павінен прыйсці мастак. Калі гэта выказванне разумець фігуральна, метафарычна—то я згодзен з такім палажэннем, але калі яго разумець літаральна (на кожны завод, фабрыку—мастака)—то не. Справа тут больш складаная, чым здаецца на першы погляд. І раней, чым прымаць якое-небудзь рашэнне, трэба дэталёва вывучыць праблему. Ні ў якім разе нельга вырашаць яе пад гарачую руку.

Уся складанасць гэтага пытання вынікае, мне здаецца, з адной даволі супярэчлівай, цяжка ўлоўнай праблемы. Я паспрабую зараз крыху разабрацца ў ёй.

Існуе на свеце такая рэч, як... Цяжка адразу сказаць, што гэта. Гэта не мода ці часовы павеў — сёння падабаюцца рэчы адной формы, а заўтра—другой. Справа ў нечым больш глыбокім. Відаць, існуюць нейкія ўнутраныя законы мастацкага развіцця, звязаныя ў нашым канкрэтным выпадку, у галіне мастацкага канструявання, і з утылітарнай функцыяй прадметаў, і з тэхналогіяй іх вырабаў, і з пэўным эстэтычным і канструктыўным коштам матэрыялаў, пэўнымі густамі людзей і г. д. Словам, ёсць нейкія ўнутраныя законы, якія кіруюць тым, што завецца прыгажосцю. Законы гэтыя складаныя, і ў тэарэтычныя палажэнні лепш глыбока не залазіць. Растлумачу на практыцы.

Учора мы цанілі ў прадметах плаўны сілуэт, самалётападобныя абцякальныя формы. Сёння пачала панаваць другая тэндэнцыя. Формы нашых прадметаў становяцца нейкія «вострыя». Паглядзіце на новы «Масквіч», на некаторыя новыя радыёпрыёмнікі, мэблю. Нам пачынаюць падабацца прамавугольныя формы. І заводам лягчэй рабіць рэчы такой формы, і ў інтэр'еры гэтыя рэчы добра ўпісваюцца. І вось, напрыклад, мастаку-адзіночку, які працуе на маленькім заводзіку, гэта ўсё так і здалося—ён глыбока пераканаўся, што прамавугольныя формы—адзіна правільныя і мастацкія. І ён пачынае працаваць у гэтым напрамку, стварае ўзоры розных прамавугольных рэчаў, якія завод будзе асвойваць для масавага вырабу. Завод, дапусцім, верыць мастаку на слова і паступова асвойвае новыя рэчы. Паколькі масавая вытворчасць—арганізацыя даволі маларухомая і кансерватыўная, то завод асвойвае новыя мадэлі звычайна марудна. Гэта звязана і са зменай тэхналогіі, і з набыццём новага абсталявання, і г. д. Так ва ўсім свеце. Таму сёлета многія заводы маюць узоры, што яны будуць выпускаць гадоў праз пяць. Але тут і ўзнікае пытанне. Хто можа сказаць, што прамавугольныя ўзоры вырабаў, прапанаваныя мастаком, не стануць неэстэтычнымі праз пяць гадоў? Мастак жа працаваў, кіруючыся адной **інтуіцыяй**. Ён мог і ўлавіць мастацкую тэндэнцыю часу, а мог і памыліцца. А калі ён памыліўся, то разам з ім памыліцца і ўвесь завод, пойдуць на вецер мільёны рублёў народных грошай. Між іншым такое здараецца ўжо і сёння. Наведайце магазіны ўцэненых тавараў. Якую новую, зусім новенькую старызну вы там ні знойдзеце! Тут і драп у ёлачку, які быў некалі модны, тут розныя жаночыя капялюшыкі і сумачкі, касцюмы і паліто, чарнільныя прыборы—сотні розных рэчаў, якія вы не хочаце браць ні за якія грошы. І калі глядзіш на ўсё гэта, дык міжволі думаеш пра той **суб'ектывізм**, з-за якога марна загінулі тысячы і тысячы рублёў. А мастак-адзіночка на прадпрыемстве, які працуе паводле сваёй інтуіцыі, мне таксама здаецца такой жа «суб'ектывісцкай з'явай». Вось часу я супроць таго, каб мастак прыйшоў на **кожнае** прадпрыемства.

Сёння, калі мы вырашаем важнае пытанне аб наданні кожнай рэчы высокіх эстэтычных якасцей, нам трэба як след прадумаць гэтае пытанне, каб потым зноў не рабіць непатрэбных рэформ, каб потым не пісаць палымяных артыкулаў пра аб'яднанне распыленых мастацкіх сіл. Гэта, дарэчы, у нас дзе-нідзе ўжо здарылася. Напрыклад, у галіне мастацкага афармлення горада. І сёння мы гаворым пра тое, каб аб'яднаць там мастацкія сілы.

Мастак-адзіночка—гэта ўсё ж саматужнік. Ён не можа ўважліва вывучыць тэндэнцыю развіцця пэўнага віду мастацтва, каб заглянуць далёка наперад і зрабіць перспектыўныя ўзоры прамысловых вырабаў. Вось чаму неабходна адразу ствараць **аб'яднанні мастакоў**. Справа мне ўяўляецца так. Буйныя заводы, такія, як аўтамабільныя, трактарны, станкабудаўнічыя, дзе работы хопіць на цэлую групу мастакоў, павінны мець свае аддзелы мастацкага канструявання. Але такія прадпрыемствы, як шчотачная, трыкатажная, абуткавыя фабрыкі і інш., ні ў якім разе не павінны мець мастакоў-адзіночак. Трэба на нейкіх базавых прадпрыемствах пры буйных спецыяльных канструктарскіх бюро ствараць групы мастакоў, якія будуць абслугоўваць цэлую галіну вытворчасці або некалькі сумежных прадпрыемстваў, напрыклад, усе шклозаводы або ўсе заводы, што вырабляюць посуд, і г. д.

Перавага такой групы мастакоў відавочная. Па-першае, тут магчымы нейкі падзел працы. Тут можна будзе глыбока вывучаць айчынны і замежны вопыт мастацкага канструявання ў пэўнай галіне, сачыць за ўсімі навінкамі, улічваць агульнае развіццё мастацтва, вывучаць густы людзей — тых пакупнікоў, для якіх і хочуць нешта выпускаць. Словам, будзе рабіцца **навуковы аналіз**, які дасць магчымасць зрабіць пэўныя рэкамендацыі па эстэтычных вартасцях прадмета. Такія аб'яднанні мастакоў дазволяць унікнуць суб'ектывізму, непрадуманых рашэнняў.

Могуць запярэчыць: у нас, маўляў, працуе ўжо Інстытут тэхнічнай эстэтыкі, які аб'ядноўвае мастацкія сілы. З цягам часу там будуць рабіць і навуковы аналіз і прымаць усе ўзоры праз мастацкі савет. Але дзейнасць гэтага інстытута, мне здаецца, мае істотны недахоп: ён адарваны ад вытворчасці. Ён—падрадчык. Там мастакі, якія б яны ні былі выдатныя, не здолеюць кожны дзень і гадзіну сутыкацца з тэхналогіяй, знаёміцца з «паводзінамі» матэрыялу ў працэсе апрацоўкі, вывучаць умовы масавай вытворчасці. Гэта ўжо адчуваецца і сёння. Інстытут працуе, але выконвае заказы марудна і не заўсёды на высокім тэхналагічным узроўні. Мне здаецца, што справа мала зменіцца і з цягам часу. Яркае сведчанне гэтаму—работа Мінскага Дома мадэляў. Новыя ўзоры, што прапануюцца яго мадэльерамі, —добрыя, на ўзроўні сусветных стандартаў. Але гэтыя рэчы прадпрыемствы не заўсёды хочуць запускаць у вытворчасць. Чаму? На сённяшні дзень, на сённяшнім абсталяванні фабрыкам нявыгадна асвойваць некаторыя ўзоры мадэльеру Дома мадэляў. Гэтыя ўзоры — як добрае пажаданне, як мара. Зразумела, трэба і гэта, але трэба даць фабрыкам і добрыя сучасныя тэхналагічныя ўзоры, каб яны маглі асвоіць іх ужо сёння. Добра вывучыўшы тэхналогію, гэта, зразумела, можна зрабіць. І такое веданне тэхналогіі можа быць толькі тады, калі мастак працуе побач з вытворчасцю, на заводзе. Вось чаму, на маю думку, трэба арганізоўваць групы мастакоў на базавых прадпрыемствах. Станоўча вырашыць гэтае пытанне не дапамогуць і эксперыментальна-вытворчыя майстэрні, якія будуць у Інстытуце тэхнічнай эстэтыкі. Абсталяванне, тэхналогія і арганізацыя працы ў іх не будуць супадаць з умовамі работы на прадпрыемстве, дзе вырабляецца масавая прадукцыя. Усё ж яны **эксперыментальныя**, і гэта не дасць мастакам магчымасці тонка ўлічыць патрэбы масавай вытворчасці і стварыць мадэлі, якія дырэктары прадпрыемстваў літаральна хапалі «гарачанькімі»—бо яны і сучасныя, і ходкія, і вельмі добра «ўпісваюцца» ў тэхналогію фабрыкі.

Гэтыя групы мастакоў на базавых прадпрыемствах, якія абслугоўваюць рад фабрык, магчыма, нават пажадана, аб'яднаць у пэўную арганізацыю. І, магчыма, яны будуць філіяламі альбо базавымі лабараторыямі таго ж Інстытута тэхнічнай эстэтыкі.

Тут узнікае яшчэ пытанне аб кантролі за эстэтычнай якасцю прадукцыі. Сёння звычайна бывае так. Узор, які асвоіла фабрыка, нават і нядрэнны. Але пачалася масавая вытворчасць і ўзор — не пазнаць. Змянілі матэрыял, фарбы, спрасцілі тэхналогію — і ў магазіны ідуць рэчы, якія ніхто не хоча браць. Аддзел тэхнічнага кантролю, які існуе на заводзе, звычайна прапускае гэтыя недабракасныя з эстэтычнага пункту гледжання тавары, бо яны адпавядаюць дзяржаўным стандартам па ўсіх паказчыках. Эстэтычных жа якасцей дзяржаўныя стандарты не ўлічваюць. Вось чаму, мне здаецца, на заводах і фабрыках павінен быць спецыяльны кантроль за мастацкай якасцю прадукцыі. Магчыма, яго павінна ажыццяўляць спецыяльная аўтарытэтная камісія, якая ўстанаўлівае адпаведнасць масавай прадукцыі ўзору. Нам трэба больш пэўна ўстанавіць, што такое **спажывецкая якасць вырабу**. Можна падумаць, што гэта рэчы агульнавядомыя. Аднак практыка паказвае, што адзінага падыходу да ацэнкі якасці няма. У гэтае паняцце звычайна не ўваходзіць эстэтыка вырабаў. Вось чаму, пакуль мы не вызначым дакладна, што такое спажывецкая якасць вырабаў, на прадпрыемствах павінны быць кантралёры прыгажосці масавых вырабаў.

Артыкул «Чалавек — тэхніка — прыгажосць» узнімае рад цікавых пытанняў. Але, мне здаецца, яго аўтары крыху звузілі праблему. Трэба разглядаць прамысловую эстэтыку ў больш цеснай сувязі з вытворчасцю, тэхналогіяй. Трэба ўскрываць аб'ектыўныя з'явы, якія перашкаджаюць таму, каб рэчы набылі высокія эстэтычныя якасці. Тут у нас яшчэ столькі нявырашанага, блытанага. Іменна тут, мне здаецца, многа суб'ектывізму, які перашкаджае выробляць прыгожыя рэчы. Вось чаму трэба больш глыбока аналізаваць работу вытворчасці, праблему цэнаўтварэння і іншыя рэчы і паказваць, даводзіць, што іменна тут найчасцей закладзены той кансерватызм, па прычыне якога наш рынак насычаецца рэчамі непрыгожымі і нязручнымі.

А. ЛАЎРЭНЦЬЕЎ,
старшы інжынер Беларускага філіяла Усесаюзнага пастаяннага павільёна лепшых узораў тавараў народнага спажывання.

ТВОРЧАЯ ВУЧОБА

Чацвёрты дзень працуе ў Мінску семінар кіраўнікоў самадзейных тэатральных калектываў прафсаюзаў рэспублікі, у якім прымае ўдзел 75 чалавек.

Са словам прывітання да ўдзельнікаў семінара звярнулася народная артыстка БССР В. Галіна.

Праграма семінара змястоўная і цікавая. Даклад аб задачах тэатральных калектываў у сувязі з падрыхтоўкай да Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады, зрабіла інструктар культмасавага аддзела Беларускага савета прафсаюзаў А. Марцьянава.

Удзельнікі семінара праслухалі некалькі лекцый па тэатральнаму мастацтву: кандыдата мастацтвазнаўства А. Сабалеўскага «Вобраз сучасніка ў савецкай драматургіі», доктара мастацтвазнаўства Ул. Няфёда «Гісторыка-рэвалюцыйная тэма ў беларускай драматургіі і ўвасабленне яе на сцэне прафесіянальных і народных тэатраў», рэжысёра тэатра Савецкай Арміі Ю. Сяргеева «Рэжысёр, яго роля і значэнне ў творчым працэсе», заслужанага дзеяча мастацтва Казахскай ССР В. Галубовіча «Сучаснае афармленне гісторыка-рэвалюцыйнага спектакля».

Кіраўнікі тэатральных калектываў абмяняліся вопытам сваёй работы. Рэжысёр агіттэатра «Усмешка» Магілёўскага завода штучнага валакна Ул. Бараноўскі сваё выступленне прысвяціў тэме «Агітбрыгада — адна з форм тэатральнага мастацтва». Думкамі аб вучэбна-пастановачнай і выхаваўчай рабоце ў самадзейным тэатральным калектыве падзяліўся рэжысёр Бабруйскага народнага тэатра клуба мясцовай прамысловасці Б. Шурын.

Для ўдзельнікаў семінара быў наладжан прагляд новай праграмы агітбрыгады Палаца культуры камвольнага камбіната і спектакля народнага тэатра трактарнага завода «Юнацтва бацькоў» Б. Гарбатава. Разгляд спектакля правёў Ю. Сяргееў.

Рэжысёры тэатральных калектываў сустрэліся з народнымі артыстамі СССР Б. Платонавым і П. Малчанавым, праглядзелі фільм пра народнага артыста СССР Г. Глебава, пазнаёміліся з выдатнымі мясцінамі беларускай сталіцы.

ЧУЦЕН ГОЛАС НАШ ДАЛЁКА

ПАСЛЯ ПАЕЗДКІ ПА БЕЛАРУСІ

У мінулым годзе «Літаратура і мастацтва» пазнаёміла чытачоў з паэзіяй лужыцка-сербскага паэта Кіта Лоранца, які наведаў Беларусь па запрашэнню часопіса «Полымя». Ён пазнаёміўся з жыццём і творчасцю беларускіх літаратараў, з Мінскам, зрабіў паездкі па нашай рэспубліцы. Свае пачуцці, уражанні, назіранні наш лужыцкі сябар выказаў у вялікай нізцы вершаў. Яна нядаўна апублікавана ў літаратурным дадатку да лужыцка-сербскай газеты «Нова доба» пад назвай «Паездка ў Беларусь у 1965 годзе». Гэта ўзнёслыя паэтычныя радкі пра Мінск, Брэст, пра гераічных беларускіх партызан, пра прыроду нашага краю. Да аднаго са сваіх вершаў Кіта Лоранц узяў эпіграф з верша Я. Купалы «А хто там ідзе?».

Цяпер паэт А. Зарыцкі робіць пераклады новых вершаў Кіта Лоранца пра Беларусь.

У РОЗНЫЯ КУТКІ СВЕТУ

Па просьбе Міжнароднай студыі дакументальных і навукова-папулярных фільмаў у ФРГ накіраваны беларускія фільмы «Мой горад», «Лясны этюд» і іншыя. Яны будуць паказаны па тэлебачанні ў серыі перадач «Савецкі Саюз. Партрэт краіны».

Дакументальныя фільмы «Мой горад» і «Звычайная хроніка» будуць дэманстравацца ў час Дэкады бельгійска-савецкай дружбы ў кастрычніку гэтага года. З Мінска ў Бельгію адпраўлена таксама вялікая партыя беларускай літаратуры, сувеніраў. Беларускі нацыянальны касцюм будзе паказаны на стэндзе, прысвечаным пятнаццаці саюзным рэспублікам Савецкага Саюза. У час дэкады будзе экспанавацца і буйнафарматная фотавыстаўка «Савецкая Беларусь сёння».

Беларускія сувеніры і нацыянальныя касцюмы адпраўлены таксама ў Аўстралію, Камбоджу, Індыю, Канаду, Францыю, дзе адбудуцца выстаўкі, прысвечаныя Савецкаму Саюзу.

ПАДАРУНАК З ЧЭХАСЛАВАКІІ

Шчыра апладзіравалі чэшскія сябры артыстам брэсцкага народнага танцавальнага ансамбля «Радасць», які быў удзельнікам фестывалю народнага мастацтва ў Стражніцы. Потым брэстаўчане зрабілі турнэ па гарадах Чэхаславакіі. Пабывалі яны ў горадзе Нітра. І, як заўсёды, цёплыя сустрэчы, сяброўскія гутаркі, знаёмствы. І песні, і танцы, то віхурныя, як «Лявоніха» і «Беларуская полька», то суровыя, як харэаграфічная кампазіцыя «Бяссмерце», то плаўныя, як карагоды беларускіх «бярозак».

Чэшскія сябры з Нітры імкнуліся адлюстраваць усё гэта ў шматлікіх здымках. Гэтымі днямі яны прыслалі брэсцкім сябрам прыгожа афармлены фотаальбом на памяць аб сустрэчах. На вокладцы яго шчырыя словы: «Дарагім сябрам і братам — членам ансамбля песні і танца «Радасць» з г. Брэста (БССР) ад раённага камітэта Саюза чэхаславацка-савецкай дружбы ў Нітры».

На здымку, які ўзяты з фотаальбома, адлюстраваны момант сустрэчы юных жыхароў Нітры з удзельнікамі Брэсцкага ансамбля песні і танца.

САД НА ГАРАДСКОЙ ВУЛІЦЫ

У ГЭТЫ дом па вуліцы Васняцова, што ў Заводскім раёне сталіцы, кожны дзень прыходзіць многа людзей. Адны з іх знаёмыя гаспадару — Васілю Ільічу Вязуглаву, другіх ён бачыць упершыню. Але ўсіх сустракае ветліва, добразычліва і адразу ж пачынае паказваць свой цудоўны сад. Сапраўды, тут ёсць на што паглядзець. Гэта адменны куток прыроды, дзе сабраны расліны з розных канцоў краіны.

Над верандай навісаюць густыя лозы сталовага вінаграду з цяжкімі гронкамі. У Васіля Ільіча тры кусты марозаўстойлівага «байтура», пяць укрыўных гатункаў, ёсць славутыя «жаночыя пальчыкі». Да 80 кілаграмаў дае, напрыклад, кожны куст «байтура». Па смаку гэты віноград не горш за крымскі, малдаўскі і балгарскі.

А вось яблыні. Іх дванаццаць. На большасці дрэў прышчэплена і расце ад двух да чатырнаццаці розных гатункаў. Не менш здзіўляюць і грушы. На адной з іх побач з яе «роднымі» пладамі раптам бачыш наліўны яблык. На трох «бязуглаўскіх» грушах расце да васемнаццаці прышчэпленых гатункаў іншых груш.

Уздоўж паркана раскашуецца маліна з мноствам салодкіх і буйных ягад. І яшчэ ў двары ёсць некалькі кустоў чорных парэчак двух гатункаў, агрэсту, таежнага лімоніка, айвы японскай, чарнаплоднай рабіны.

І ўсё ж галоўнае захапленне Васіля Ільіча — кветкі. Пра іх ён гатоў гаварыць бясконца.

У казачным садзе — 21 куст ружаў, сярод іх такія гатункі, як «Дабрыня Нікіціч», «Афелія», «Флорыя Дэй», «Кантраст», «Нью Даўн» і іншыя. Півоні прадстаўлены сямю гатункамі. Колеры іх — чырвоны, ружовы, белы, крэмавы, цёмна-вішнёвы і нават яблыкавы.

Сто гатункаў гладыёлусаў. Столькі ж вяргінь. 21 гатунак флоксаў, сем — лілей. Затым ідуць цюльпаны, нарцысы, прымулы, спаржа, віёла, гваздзіка, браткі... А як прыгожа цвіце ўсходні мак!

Вось кусты, падобныя на вялізныя бэзавыя шапкі. Гэта грунтовая гартэнзія, якая цвіце амаль два месяцы.

Не, усяго не пералічыш.

Можна сабе ўявіць, якога догляду, цярплівай і вялікай працы патрабуе штодзённа гэты сад. У Васіля Ільіча няма дыплома агранома, але ёсць вялікая любоў да прыроды, да прыгажосці. Ён пастаянна цікавіцца спецыяльнай літаратурай, выпісвае часопісы «Цветоводство» і «Садоводство», падтрымлівае перапіску з кветкаводамі-аматарамі Масквы, Іркуцка, Сімферопаля, Днепрапятроўска, Львова і іншых гарадоў. Абменьваецца з імі селекцыйным матэрыялам...

Васіль Ільіч працуе ўжо 18 год на Мінскім аўтазаводзе. Быў майстрам, потым па стану здароўя стаў працаваць кантралёрам. А цяпер зноў майстар у тэрмічным цэху.

...Скончылася змена. З заводскай праходнай выходзіць пажылы каржакаваты чалавек у рабочай спяцоўцы. Ён спяшаецца дадому. Не, не на адпачынак. Ён спяшаецца ў сад да сваіх улюбёных гадаванцаў.

Л. ХАЎКІН,
урач 10-й паліклінікі
г. Мінска.

МАСКВА, ЦВЯРСКІ БУЛЬВАР, 25...

Уладзімір ПІМЕНАЎ,
рэктар Літаратурнага інстытута імя Горкага

Гучыць гэта нечакана і нават парадаксальна: пісьменніцкая вышэйшая навучальная ўстанова! Лёгка сабе ўявіць маладога чалавека, які паступае ў вышэйшую навучальную ўстанову, каб стаць урачом, інжынерам, аграномам і гэтак далей. Але міжволі насцярожваешся, калі даведваешся, што студэнт рыхтуецца стаць пісьменнікам, спецыяльна вучыцца пісаць першакласныя вершы, становіцца паэтам, уладаром дум такіх жа, як і ён сам, маладых людзей. Ды і не толькі маладых. Ён вучыцца знаходзіць шляхі да сэрцаў любых чытачоў. Вучыцца быць паэтам—ці магчыма такое? Бо паэтамі нараджаюцца, так павялося лічыць здаўна, бо талент—не часты дар...

Словам, падстаў для роздумаў, сумненняў і нават гарачых спрэчак вельмі дастаткова. Але факт застаецца фактам. Такая вышэйшая навучальная ўстанова існуе і мае зусім пэўны адрас: Масква, Цвярскі бульвар, 25, Літаратурны інстытут імя Горкага Саюза пісьменнікаў СССР.

У глыбіні двара захаваўся вялікі будынак, старадаўні асабняк, які належаў у пачатку XIX стагоддзя сенатару Якаўлеву. Тут ў 1812 годзе нарадзіўся вялікі рускі рэвалюцыйны дэмакрат і пісьменнік Аляксандр Герцэн. І так павялося па традыцыі, дом гэты стаў, асабліва пасля рэвалюцыі, родным для пісьменнікаў Масквы. Тут бывалі Уладзімір Маякоўскі, Сяргей Ясенін і іншыя вядомыя літаратары. Тут чыталіся вершы, палымяна абмяркоўваліся надзённыя праблемы станаўлення савецкай літаратуры. І няма нічога дзіўнага ў тым, што ў сценах гэтага праслаўленага «Дома Герцэна» ў 1933 годзе закіпела новае жыццё. Сюды ўварвалася сама маладосць, прынеслі сваю «іскру боскую» першыя студэнты толькі што заснаванага літаратурнага інстытута.

Сухаватая, лаканічная мова дэкрэта, падпісанага ў Крамлі Міхаілам Калініным: «У азнаменаванне 40-годдзя літаратурнай дзейнасці Максіма Горкага Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР, адзначаючы заслугі Максіма Горкага ў галіне выхавання новых пісьменніцкіх кадраў з рабочых і сялян,—**пастанаўляе:**

1. Заснаваць у Маскве Літаратурны інстытут імя Максіма Горкага.

2. Літаратурны інстытут імя Максіма Горкага арганізуецца:

а) як літаратурны навучальны цэнтр які дае магчымасць пісьменнікам, што творча сябе праявілі, і ў першую чаргу пісьменнікам з асяроддзя рабочых і сялян, павысіць сваю кваліфікацыю, атрымаць усебаковае развіццё і крытычна засвоіць спадчыну літаратурнага мінулага.

б) як лабараторыя для вывучэння мастацкай літаратуры народаў Саюза ССР...»

Цяпер гэта ўжо гісторыя. За трыццаць тры гады існавання Літаратурнага інстытута накоплены вялікі вопыт, склаўся прафесарска-выкладчыцкі склад. А пачыналі ж амаль на пустым месцы. Яшчэ Ул. І. Ленін у пачатку дваццатых гадоў папярэджваў А. М. Горкага аб цяжкасцях, звязаных з арганізацыяй такой навучальнай установы. Ленін, як успамінае Горкі, «...цікавіўся пралетарскай літаратурай:

— Чаго вы чакаеце ад яе?

Я гаварыў, што чакаю многа, але лічу зусім неабходным арганізацыю літаратурнай вышэйшай навучальнай установы з кафедрамі па мовазнаўству, замежных мовах Захаду і Усходу, па фальклору, па гісторыі сусветнай літаратуры, асобна—рускай.

— Гм-гм,—гаварыў ён, прыжмурваючыся і пахіхікваючы.—Шырока і асляпляльна! Што шырока—я не супраць, а вось—асляпляльна будзе, а? Сваіх жа прафесараў у нас няма па гэтай частцы, а буржуазныя такую гісторыю пакажуць... Не, зараз нам гэтага не ўзняць. Гадкі тры, пяць пачакаць трэба».

І вось мара Горкага здзейснілася: «шырока і асляпляльна»! І «свае прафесары... па гэтай частцы» ўзняліся, выраслі разам з інстытутам, абаранілі кандыдацкія і доктарскія дысертацыі, атрымалі вучоныя званні. Ля вытокаў творчых семінараў студэнтаў былі Канстанцін Федзін, Аляксей Суркоў, Канстанцін Паустоўскі, Барыс Рамашоў, Уладзімір Лугаўской, Міхаіл Святлоў, Усевалад Іванаў, Фёдар Гладкоў, Сяргей Гарадзецкі. Цяпер эстафету кіраўнікоў прынялі іншыя пісьменнікі, не менш славутыя і знаёмыя народу: Уладзімір Лідзін, Леў Касіль, Валерыя Герасімава, Георгій Бярозка. Цікава, што такія кіраўнікі сённяшніх семінараў, як Яўгеній Далматоўскі, Барыс Бедны, Леў Ашанін, Грыгорый Бакланаў, Васілій Захарчанка і іншыя, самі скончылі ў свой час Літаратурны інстытут, сталі членамі Саюза пісьменнікаў СССР. Такая літаратурная пераемнасць, вельмі заканамерная і важная для замацавання творчых традыцый гэтай цудоўнай, самабытнай навучальнай установы.

Якім жа чынам адбываецца набор у Літаратурны інстытут, як вызначаецца ступень таленавітасці таго або іншага абітурыента? Любы грамадзянін Савецкага Саюза, які піша вершы або празаічныя творы, мае права прысылаць свае работы на творчы конкурс, які праводзіцца ў два туры. Конкурс, вядома, надзвычай жорсткі, адбіраюцца толькі сапраўды шматабяцаючыя творы. Напрыклад, сёлета было пададзена каля дзвюх тысяч работ. А прайшлі і былі прыняты, пасля здачы экзаменаў, 30 студэнтаў на вочнае аддзяленне—паэты, празаікі, і 100—на завочнае аддзяленне—паэты, празаікі, драматургі, крытыкі. Такі характар творчага конкурсу, але затое ёсць упэўненасць, што паступілі сапраўды таленавітыя людзі!

У Літаратурны інстытут паступаюць пераважна людзі з глыбін краіны, з рэспублік і абласцей, прычым патрабуецца не менш як два гады вытворчага стажу, інакш кажучы, неабходны некаторы жыццёвы вопыт, без якога пісьменніку няма пра што пісаць. У інстытуце вучацца прадстаўнікі 40 нацыянальнасцей. І сёлета прыйшлі новыя таленавітыя студэнты: празаікі—бурат Дамбаеў Гарма-Додзі, якутка Гаўрыльева, літовец Румінас; паэты—эстонец Круусваль, казах Насаналіеў, аварац Магамедаў, карачаевец Турклеў. Вельмі цікавы сваёй творчасцю паэт Васілій Макееў, калгаснік з Волгаградскай вобласці. Самабытная паэтэса Любоў Андрэева, мулярка і бетоншчыца з Сібіры...

Усе яны яшчэ толькі-толькі ўвайшлі ў сцены інстытута, яшчэ не згасла экзаменацыйнае хваляванне, яшчэ наіўныя і нясмелыя іх думкі аб сваёй творчай будучыні, яшчэ толькі прыглядаюцца яны да сваіх будучых выхавацеляў. Але ўжо сур'ёзнае і святое іх стаўленне да ўсяго, што акружыла іх у сценах «Дома Герцэна», дзе сама абстаноўка, сама атмасфера садзейнічае высокай творчасці. Ходзяць першакурснікі па калідорах, сядзяць у аўдыторыях, спяшаюцца ў бібліятэку і не могуць не падбадзёрыць сябе думкаю, што па гэтых жа калідорах і ў гэтых жа аўдыторыях шмат гадоў назад (хто і ўсе дваццаць пяць год, а хто і бліжэй да нашых дзён!) хадзілі і сядзелі і таксама хваляваліся тагачасныя першакурснікі Канстанцін Сіманаў, Сяргей Міхалкоў, Антаніна Капцяева, Уладзімір Салаўхін, Уладзімір Цендракоў, Яўгеній Вінакураў, Маргарыта Алігер, Аляксандр Мяжыраў, Расул Гамзатаў, Віктар Розаў, Роберт Раждзественскі, Васілій Фёдараў, Юлія Друніна, Сяргей Нараўчатаў, Чынгіз Айтматаў і многія-многія, чые імёны і прозвішчы з-за недахопу месца немагчыма тут прывесці, але якія, выйшаўшы са сцен Літаратурнага інстытута, пасля абароны дыплома, узбагацілі сваёй творчасцю літаратурнае жыццё краіны.

Выпускнікі інстытута імя А. М. Горкага—залаты фонд савецкай літаратуры, якая развіваецца, дзейнічае. І многія з гэтых пісьменнікаў, якія ўжо даўно сталі вядомымі за межамі Савецкага Саюза, не-не ды і ўспомняць добрым словам сваю «альма-матэр», старадаўні асабняк у глыбіні двара, дзе пад шумнымі таполямі стаіць бронзавая статуя Аляксандра Герцэна.

АДН.

Вераснёўская цішыня

Фотаэцюд В. ДОННІКАВА.

АБМЕРКАВАННЕ ВЫСТАЎКІ ЮГАСЛАЎСКАГА ПЛАКАТА

Амаль месяц у Мінскім мастацкім салон-магазіне экспануецца выстаўка югаслаўскага плаката. Яна з'яўляецца як бы працягам знаёмства беларускіх гледачоў з мастацтвам сацыялістычнай Югаславіі, якое распачалося некалькі месяцаў назад, калі ў Дзяржаўным мастацкім музеі мінчане бачылі выстаўку твораў югаслаўскай графікі часоў барацьбы супраць фашызму ў другую сусветную вайну.

Днямі Саюз мастакоў БССР правёў абмеркаванне гэтай цікавай, змястоўнай выстаўкі, якая вельмі своеасабліва расказвае пра сённяшняе жыццё Югаславіі.

У абмеркаванні прынялі ўдзел старшыня секцыі плакатнага мастацтва Саюза мастакоў БССР Л. Кроль, мастакі Т. Ігнаценка, І. Радунскі, Л. Замах, А. Гершановіч, А. Чысцякоў. У сваіх выступленнях яны адзначалі, што югаслаўскія плакаты змястоўныя, лаканічныя, выкананы на высокім прафесіянальным узроўні. Усе прамоўцы выказалі таксама думку, што экспазіцыя плаката складзена з густам. Падобныя выстаўкі, як гэта, наладжаная югаслаўскімі калегамі ў Мінску, паспрыяе развіццю сяброўскіх адносін паміж беларускімі і югаслаўскімі мастакамі.

ЗНАЁМСТВА АДБЫЛОСЯ

Чатыры сельсаветы адышлі нядаўна з Лёзненскага ў Віцебскі раён. Цяпер гэта самыя аддаленыя ад Віцебска куткі. І вось нядаўна туды выехала агітбрыгада раённага Палаца культуры ў складзе мастацкага кіраўніка М. Каржанёва, масавіка Н. Францавай, танцораў Галіны і Паўла Гарбуновых, салісткі Л. Ярохі, баяніста М. Талстога, дырэктара Палаца культуры Ф. Левіна. Удзельнікі мастацкай самадзейнасці далі дзесяць канцэртаў—у калгасах «Чырвоны партызан», «Расія», «Усход», імя XXII з'езда і інш.

Хлебаробы цёпла сустрэлі віцяблян, запрашалі наведваць іх часцей.

Л. БАРАЗНА.

КАЛДОБІСТЫЯ ДАРОГІ КІНАФІКАТАРАЎ

Я НЕ сустракаў людзей, якія б былі так расчараваны ў сваёй справе, як кіраўнікі Добрушскага галаўнога кінатэатра.

— Тут міжволі станеш песімістам,—сказаў мне Уладзімір Георгіевіч Еўкін, намеснік дырэктара, і паказаў рукой на сцяну кабінета, дзе вісеў вялікі аркуш паперы, спісаны лічбамі.—83 працэнты плана.

— Бывае...—няпэўна сказаў я.— Зводка гэта такая рэч — сёння ўнізе, заўтра, глядзіш, уверсе...

— Н-не,—Еўкін нават пакрыўдзіўся за такое мае меркаванне. — Вы ж глядзіце, што ні год, то ўсё горш і горш. Але ж што будзеш рабіць?

— Няма выйсця?

Еўкін паціснуў плячыма:

— Бачыце, раён наш эканамічна вельмі моцны, таму людзі ў кіно не ходзяць.

— Людзі таму не ходзяць у кіно, што добра жывуць?—здзівіўся я.

Намеснік дырэктара паглядзеў на мяне, як на немаўля:

— А то ж... Праз хату тэлевізар...

Тэлевізар... Не першы раз даводзіцца мне чуць такі аргумент кінафікатараў. Ці маюць яны рацыю? Не будзем спяшацца з адмоўным адказам.

Так, тэлебачанне «адкалола» ад кіно частку гледачоў. Але перш за ўсё там, дзе дэманстрацыя фільмаў на блакітным экране арганізавана не так, як трэба. Прывяду прыклад. У пачатку жніўня Гомельскае тэлебачанне дэманстравала фільм «Закон Антарктыды», а праз тыдзень абласны кінапракат прыслаў гэтую кінастужку ў Добрушскі раён. І гэта не выпадак, гэта стала частай з'явай.

— У мяне на дэманстрацыю такіх фільмаў прыходзіць пяць чалавек,— скардзілася мне адна з лепшых кінамеханікаў раёна Яўгенія Сяргееўна Кузьміна.—Няўжо там, на тэлебачанні, не разумеюць, што сваёй спешкай наносяць эканамічную шкоду дзяржаве. Гэта ж так бы ў мяне паглядзела карціну сто чалавек, а так...

Наіўная жанчына. Тэлебачанне — гэта ж зусім іншае ведамства. Яно думае пра кінафікацыю столькі, колькі пра леташні снег. Праўда, ёсць пастанова, якая прадугледжвае пэўны тэрмін, які павінен раздзяляць паказ фільма ў кінатэатры ад яго паказу па тэлебачанні. Але ж пастанову можна і абысці...

І ўсё ж няпраўда, быццам людзі не ходзяць у кіно толькі таму, што маюць тэлевізары. Ёсць яшчэ многа і многа вельмі важных прычын. Паспрабуем у іх разабрацца.

Мне давялося доўга гутарыць з Яўгеніяй Сяргееўнай Кузьміной, пра якую я толькі што ўпамінаў. Гэтая невысокая, хударлявая, вельмі рухавая жанчына пятнаццаць год працуе кінамеханікам. (Можна смела спраўляць юбілей. Кінамеханікаў з такім стажам на Гомельшчыне, ды ці толькі на Гомельшчыне, па пальцах палічыш). Абслугоўвае Яўгенія Сяргееўна калгас «Беларусь»—гэта кіламетраў за пятнаццаць ад раённага цэнтра. Калгас добры, заможны, тут многа тэлевізараў, але, між тым, Кузьміна амаль адзіная сярод кінамеханікаў раёна з месяца ў месяц перавыконвае фінансавы план. Што і казаць—гэта спецыяліст сваёй справы. І любіць яе, і разумее, як лепш прапагандаваць той ці іншы фільм. Але поспех Яўгенія Сяргееўна тлумачыць іншым.

— Клуб у калгасе добры, цёплы, утульны. Ну, і кіраўнікі гаспадаркі ставяцца да кіно сур'ёзна. Не было ні разу, каб у мяне сарваўся кінасеанс з-за таго, што заняты клуб ці не падвезлі кінастужку. Вось і нядаўна дэманстравала я фільм, а раптам пагасла святло. Ды надоўга. Думаю, што ж рабіць? Назаўтра ў клубе намечана нейкае калгаснае мерапрыемства, на паслязаўтра па графіку новы фільм. Пайшла да калгаснага парторга, расказала ўсё. І што ж вы думаеце? Перанеслі мерапрыемства на іншы час, а залу аддалі мне...

Але неўзабаве я ўпэўніўся—у такіх умовах у раёне прыходзіцца працаваць далёка не ўсім. У многіх гаспадарках кінафікатараў толькі што церпяць. Па сутнасці яны з'яўляюцца арандатарамі памяшканняў. Над кінамеханікам тут многа гаспадароў—трэба дагадзіць перш-наперш загадчыку клуба, потым кіраўнікам гаспадаркі, якім ад дэманстрацыі фільма ні цёпла, ні холадна. У іх свае планы. У вёсцы Карма (калгас «Абарона») нядаўна тры разы запар зрываўся кінасеанс толькі з-за таго, што калгасныя кіраўнікі збіраліся ў гэтыя дні тут правесці нейкія свае мерапрыемствы.

Доўгі час не дэманстраваліся фільмы ў Кругоўскім клубе (калгас «Рассвет») толькі таму, што на сцэне тут размясцілася бібліятэка, і бібліятэкар, вядома, у сваю адсутнасць не хоча нікога пускаць у памяшканне, а сядзець у клубе ў час дэманстрацыі кіно і глядзець, каб ніхто не залез на сцэну, яму ахвоты мала.

А ўзяць такія факты. Многія калгасныя і саўгасныя клубы ў перыяд уборкі ўраджаю былі ператвораны ў збожжасховішчы. У калгасе імя Гагарына, напрыклад, збожжам былі засыпаны ўсе тры клубы, якія тут ёсць.

А колькі кінасеансаў сарвалася таму, што клуб, дзе павінен дэманстравацца фільм, людзі мінаюць, бо там няўтульна, холадна, брудна. Мне давялося пабываць у адным з такіх «асяродкаў культуры»—у вёсцы Ачэса-Рудня (калгас «Рассвет»; між іншым, гэта адна з самых багатых гаспадарак у раёне). У памяшканне страшна зайсці. Падлога згніла, вокны пабітыя, столь свіцціца, у памяшканні няма ніводнай лаўкі.

І яшчэ адно пытанне. Пытанне аб кадрах кінамеханікаў.

— Цякучка ў нас страшэнная,— скардзіцца бухгалтар Добрушскага галаўнога кінатэатра В. Балмакова.— За год мяняецца чацвёртая частка ўсіх кінамеханікаў. Асабліва не затрымліваецца моладзь. Вось толькі, здаецца, скончыў хлопец школу кінамеханікаў, глядзіш—праз якія паўгода яго ўжо ў нас няма. Сёння ў нас не хапае васьмі кінамеханікаў і столькі ж памочнікаў.

Прычыны гэтага — усё тое, пра што мы ўжо расказвалі. І яшчэ—трэба глядзець праўдзе ў вочы—кінамеханік у нас амаль самая нізкааплачваемая спецыяльнасць.

Я расказаў пра цяжкасці добрушскіх кінафікатараў у Гомельскім абласным упраўленні кінафікацыі. Там мяне «супакоілі», маўляў, такое можна ўбачыць і ў любым іншым раёне вобласці. Дык тым больш тады трэба хутчэй біць трывогу, тым больш няма падстаў сядзець склаўшы рукі і чакаць перамен. Сельскі кінафікатар чакае дзейснай дапамогі.

М. ЗАМСКІ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

У МАЙСТЭРНЯХ Мастакоў

НЕСПАКОЙ

Іменна гэтым словам лепш за ўсё вызначыць той творчы пошук, які вядзецца мастаком Яўгенам Красоўскім. Высакародны неспакой мастака, штодзённае творчае гарэнне — гэтай атмасферай працінаешся, калі наведваеш яго майстэрню.

Тут мноства работ — і выкананых раней, у даўнія гады, і тых, над якімі мастак працуе цяпер: экслібрысаў, зробленых у тэхніцы лінагравюры, пейзажаў, пісаных маслам і ў тэхніцы аўталітаграфіі, жывапісных партрэтаў, манатыпій.

Вось пейзажы Ленінграда, Масквы, створаныя ў час нядаўніх паездак мастака па краіне, пейзажы Мінска, італьянскія краявіды. Іх многа — дзесяткі і дзесяткі. Вось аўталітаграфіі — сённяшняе аблічча Масквы і Ленінграда. Вось партрэты калег па прафесіі — мастакоў Ткачука і Лойкі. Вось нацюрморт у тэхніцы эннаустыкі. І ў той жа тэхніцы — кампазіцыя з фехтавальшчыкам.

— Многа часу аддаю цяпер графіцы.— кажа Яўген Яўстаф'евіч. — Бо графіка дае магчымасць фіксаваць уражанні куды хутчэй, чым жывапіс. А гэта вельмі важна для мастака...

Ён паказвае серыю манатыпій — лісты, прысвечаныя антываеннай тэме: «Трасцянец», «А пераможа жыццё!..», «Пратэст». Яны эмацыянальныя, выразныя, скіраваныя супраць атамнай вайны.

А на станку — вялікае палатно, закрытае ад вачэй прысутных. Мастак тлумачыць, што тут — вялікая кампазіцыя «Кастрычнік. 1917». Новая карціна прысвячаецца слаўнаму 50-годдзю Савецкай улады.

— А якія яшчэ задумы да 50-годдзя Вялікага Кастрычніка? — пытаюся.

Яўген Яўстаф'евіч усміхаецца і кажа ў адказ:

— Задум многа. Рана яшчэ гаварыць, як яны будуць ажыццёўлены. Але будуць, абавязкова будуць работы, апрача гэтай кампазіцыі... І — я ўпэўнены — мастак стрымае слова. Бо працуе многа, напружана, штодзённа. Ім валодае высакародны неспакой.

Ул. БРЫГ.

На здымку: мастак Яўген Красоўскі ў сваёй майстэрні.

Фота І. ЗМІТРОВІЧА.

З АРХІВА КАМПАЗІТАРА

У Цэнтральны дзяржаўны архіў літаратуры і мастацтва БССР паступіў фонд народнага артыста БССР, старэйшага кампазітара Беларусі М. Чуркіна. Сярод дакументаў—песні, рамансы, хоры на словы Я. Купалы «Я калгасніца», «Выйдзі, дзяўчынка», «Як у лесе зацвіталі», «Беларускім партызанам», Я. Коласа—«Уцякай, мароз», «Гусі», «Ручэй», «Лес», «Вясна», «Асенні дождж», «Пахмелле», П. Броўкі, П. Глебкі, М. Танка і іншых паэтаў.

Тут жа ноты з музыкай да драмы Я. Купалы «Раскіданае гняздо», якую паставіў на сваёй сцэне тэатр імя Якуба Коласа. Яна прайшла з вялікім поспехам у Маскве (1955 г.) у час Дэкады беларускай літаратуры і мастацтва.

Яшчэ ў дарэвалюцыйны час М. Чуркін пачаў збіраць і запісваць беларускія народныя песні. Ён вандраваў па розных кутках Беларусі. У архіве захоўваюцца справаздачы па збіранню беларускіх народных песень з нотамі, тэкстамі і фотаздымкамі выканаўцаў.

У архіве будуць захоўвацца і аўтабіяграфія М. Чуркіна, шматлікія фотаздымкі і іншыя матэрыялы.

К. НЕКРАШ,
старшы навуковы супрацоўнік
архіва літаратуры і мастацтва.

Павел МІСЬКО



АПАВЯДАННЕ

Такія дзівосныя сны прыходзяць да чалавека якраз на мяжы явы і сну, калі хочацца прачнуцца, але не можаш, салодкая дрымота моцна трымае яшчэ ў абдымках...

Ён нібы плыў па шырокім, як згледзець, разліве. Плыў свабодна, лёгка, як гэта бывае толькі ў сне, і цела — дужае, гнуткае—слухалася самага нязначага руху ног і рук. Ён нават не плыў, а лунаў у цёплай-цёплай, быццам падагрэтай, аранжавай вадзе, даваў нырца, расплюшчваў пад вадою вочы (якраз як у дзяцінстве) і ніколечкі не здзіўляўся, што і на глыбіні вада не жоўтая ці зялёная, а ружова-аранжавая, усплываў дагары на паверхню — паволі-паволі, як пушынка, — скрозь сонечнае мільгаценне і бляск хваль і бачыў такое ж аранжавае неба, аранжавае сонца, і летуценны дзіцячы голас даводзіў, што і людзі ўсе сталі аранжавымі і чамусьці аранжава спяваюць...

А вось ужо не спяваюць, а проста гавораць...

— Спіць? — праразаецца аднекуль мужчынскі голас і сам сабе адказвае: — Ну, няхай паспіць...

— Прачнулася ўжо, маё сонейка, маё кацянётка залатое...—буркуе жаночы голас.

— Ага-а-а... Ага-а-... — гукае малое.

Юльян Іванавіч азіраецца па баках — адкуль гэтыя галасы? І бачыць, як міма плыве ў рыбацкім чоўне ўчарашні бакеншчык. Стаіць у чоўне, як манумент, а лодка нібы і не плыве, а вісне ў паветры... Побач — дзяўчына, у руках трымае вышываны ручнік. І знекуль сочыцца цяжкі цымбальны звон. «А чаму дзіцячы голас? Адкуль дзіця на рацэ, на разліве? Дзіця... адкуль?» — непакоіцца Юльян Іванавіч, варушыцца і, мусіць, ад таго прачынаецца...

Проста ў твар па-веснавому б'е, слепіць сонца. Канапка, на якой ён ляжыць, стаіць адразу ля адчыненых дзвярэй — гэта адтуль дастае яго нізкае сонца. Недзе прарэзліва чвікаюць вераб'і — найначай у лужыне. Сціпана грае радыё. Юльян Іванавіч падсоўваецца вышэй на падушцы, хавае твар ад сонца і чуе, як глуха, прытоена ные ўсё цела, напамінае аб мінулай ночы.

Ён акідвае позіркам пакой. На пабеленых сценах — рамкі са здымкамі, у кутку, дзе ў вясковых хатах дзе-нідзе вісяць яшчэ абразы, партрэт Гагарына. Пакой невялікі, перагароджаны дзвюма шафамі і вішнёвымі, у жоўтыя ружы, шторамі. За шафамі, мабыць, спальня. Там сваё акно, сваё сонца, і ў гэтым сонцы (відаць праз шчыліну) сядзіць на ложку тая ж дзяўчына, што была на рацэ ў сне. На руках у яе малое. Яно прагна ссе—снедае.

— Памаленьку, дурненькі, я ж нікуды не ўцякаю, — паціху размаўляе дзяўчына з дзіцем. — Уй, як мы прагаладаліся, бедненькія... Нехарошая ў цябе, сыночак, мама: зарабілася, дак і забула, што Іванку пара естачкі... — Яна расшпільвае яшчэ адзін гузік на белай, з кветкамі на рукавах блюзцы — каб было ямчэй.

«Мадонна з дзіцем... Палеская мадонна», — Юльян Іванавіч сцішвае дыханне, каб не пачулі за шторамі, што ён прачнуўся ўжо, што незнарок падгледзеў такі інтымны іхні занятак. Сціпіўся, але глядзеў. Сонца іскрылася ў рыжаватых кудзерках маладзіцы, што свавольна вырваліся з-пад тоўстай касы і пушыста абрамілі белы высокі лоб. Праменні высвечвалі кожную вяснушку на яшчэ круглых, дзявочых шчоках, невялікім, правільным носіку.

— А-ёй, а мы ж сённека і не ўмуваліся яшчэ? Ну, перадыхні, перадыхні, а я памую майго зайчыка, маё кацянётка малое... — Яна пырскае ў твар малога струменьчыкам малака.—Во-цё-цё... Во-цё-цё-ханькі... Будземо чысценькімі, будземо гарненькімі... Каб не сорамна было людзям паказацца... Во-цё-цё... Зморшчыўся? Не ўпадабаў? Або-о... І ты ўжо разумееш, шчо добра, а шчо кепска? І ты не памуляешся? Дурненькі ты мой... Я вялікая, і то не разумею... А можа я горш дурная, чым ты?..

Яна зноў сунула малому ў рот ружовы сасок. На ім блакітнай іскрынкай бліснула кропля малака. Юльяну Іванавічу стала зусім няёмка. Ён хацеў паціху ўстаць, але касцюма яго нідзе не было. Не было і чаравікаў. Дзе ён паскідаў усё гэта ўчора?..

Маладая маці ўжо напявала нешта пяшчотнае, без слоў, праціраала малога ражком пялёнкі. І пад гэты салодкі спеў Юльян Іванавіч задумаўся, а мо ізноў крыху задрамаў. І ясна ўявілася яму ўсё, што здарылася з ім мінулай ноччу.

Ніхто ў рэдакцыі не ведаў, што на Палессі ўжо снегу і звання няма, што там мора вады. У райцэнтр, праўда, ён прыкаціў без усялякіх прыгод, цягнікам. Яшчэ ў дарозе распытаў, што да Зарачан можна даехаць з Гарадка кацерам ці «рачным трамваем»: ні Прыпяці ўжо з гыдзень як адкрылася навігацыя. Праўда, ад Зарачан давядзецца яшчэ дабірацца кіламетры два да месца, але, казалі, к цеплаходу прыходзяць лодкі, яны і падкінуць яго, калі што якое... А пешкі ці якой машынай дабрацца ў калгас — «і не думай, і не мыслі...»

І ўсё было гэтак, як казалі яму. Быў і «трамвай»: недзе каля трох гадзін папаўдні ішоў апошнім рэйсам да Мазыра. Ён якраз паспеў на яго,

Сярод кніг

З ПЕРАЖЫТАГА І ПЕРАДУМАНАГА

Вядома, што сапраўднае мастацтва — гэта заўсёды сплаў душэўнага вопыту аўтара і «знешняга» матэрыялу. Калі жыццёвы матэрыял блізкі пісьменніку, калі ён прапушчаны праз яго сэрца, то матэрыял гэты становіцца фактам мастацтва. Калі ж такога сплаву няма, пісьменніка падпільноўвае няўдача. Гэта прыгадалася мне ў сувязі з уражаннямі ад першай кніжкі прозы Еўдакіі Лось «Пацеркі».

Стала ўжо банальнасцю гаварыць аб пераходзе паэта ў прозу. Звычайна рэцэнзенты ў такіх выпадках пішуць: «Паэт напісаў аповесць, кніжку апавяданняў...» Тым самым нібы просяць прабачэння ў патрабавальнага чытача — маўляў, даруйце, не судзіце аўтара занадта строга, бо ён выступае не ў сваім «амплуа», як быццам прырода жанру не патрабуе аднолькавых да сябе адносін ад аўтара, кім бы ён ні быў.

Дык вось, зборнік апавяданняў Еўдакіі Лось «Пацеркі»...

У невялічкім уступе аўтар сціпла піша: «У змешчаных тут кароткіх апавяданнях мне хацелася сказаць тое, што я ведаю пра жыццё і людзей, што перажыта і перадумана. Буду рада, калі чытачу перадасца хоць часцінка майго хвалявання». Сапраўды, прачытаўшы апавяданні Еўдакіі Лось, адчуваеш у іх шмат аўтабіяграфічнага, перажытага і перадуманага. Яна ідзе цяжкай, але адзіна правільнай дарогай пісьменніка — шукае сваё, усё пазнае і ацэньвае сваім вопытам.

Адна з самых галоўных уласцівасцей літаратуры — уменне прымусіць чытача «дапісаць» лёс героя. Лепшыя апавяданні Еўдакіі Лось пацвярджаюць гэта. Яна ўмее лаканічна паказаць характар чалавека, скупымі, але трапнымі мазкамі намаляваць яго аблічча. У гэтых апавяданнях пісьменніца не разжоўвае агульнавядомыя ісціны, не займаецца непатрэбным маралізатарствам, яна спадзяецца, што чытач дамалюе ў сваім уяўленні далейшы шлях героя.

Вось апавяданне «З вайны». Напісана яно эканомна, з тонкім пранікненнем у псіхалогію чалавека. Сюжэт апавядання нескладаны. Вярнуўся з вайны Грышка Стрыжонак з вялізнымі чамаданамі, гладкі, раздабрэлы на інтэнданцкіх харчах. Вайна яго, можна сказаць, абмінула, бо не давялося яму быць пад агнём. Жонка Паша і дзеці ад радасці на сёмым небе. Але прайшоў хмель першых дзён сустрэчы, і жонка, бачачы раздабрэлага і ружовашчокага мужа, затрывожылася: «Ці так Грышка жыў, як усе на вайне, як трэба?» Аднойчы яна выказала яму свае сумненні. Адбыўся кароткі дыялог:

— Бач ты, споведзі захацела! — здзівіўся Грышка. — Скажы дзякуй, што жывога мацаеш. Пераможцы ў грахах не спавядаюцца!

— А ты хіба грэшны?

— А ты — не, ты — святая?

У гэтых словах — уся «філасофія» прыстасаванца, маральна разбэшчанага чалавека. Ён заўсёды мяркуе аб іншых па сабе, як кажуць, мерае на свой капыл: «Раз я грэшны, значыцца, і другія такія ж». Грышка не можа паверыць у дабрату і чысціню сваёй жонкі. Ён з цынічным самазадавальненнем, не саромеючыся, расказвае Пашы аб тым, якім поспехам карыстаўся ў жанчын у час службы. Душэўнай глухатой і эгаізмам патыхае ад яго слоў.

Паша не плача, сэрца яе скамянела ад крыўды. У час вайны яна зазнала гора, хадзіла ў лапцях, у хустцы па самыя бровы, каб старэйшай выглядаць, бегала з кашалём па вясновым полі, каб накарміць дзяцей мёрзлай леташняй бульбай. І Паша не вытрымала, спляжыла Грышку па яго тлустым твары. «Вось табе, вось! За мае лапці, за бульбяную гніль, за венгерскія спадніцы, за Эўджэнію!..» Так, «сапсавала вайна яе сустрэчу з мужам, ой як сапсавала!..»

Еўдакія Лось — пісьменніца лірычнага складу. У яе творах на першым месцы не сюжэт, а пачуццё, настрой. Таму, відаць, і жыццё, і людзі раскрываюцца часцей за ўсё праз успрыняцце аўтара, які нібы «ўбірае» іх у самога сябе. А калі аўтар адступае на другі план, то пісьменніца выбірае такога героя, які найбольш поўна выказвае жыццёвую пазіцыю і погляды аўтара. Адсюль у большасці твораў пісьменніцы апавяданне вядзецца ад першай асобы, без усякіх навелістычных «выкрутасаў».

У гэтым сэнсе можна нагадаць апавяданні «Цялутка», «На бальшаку», «Страшная прыкмета», «Маці», «Песня» і інш. У іх мы адчуваем аўтарскае хваляванне, боль чулай душы за тыя страшныя фізічныя і маральныя пакуты, якія прынеслі фашысты нашаму народу. Разам з ёй мы падзяляем радасць перамогі над фашызмам. Увагу пісьменніцы ў гэтых творах запыняюць часам дэталі, якія могуць падацца нават выпадковымі. Але гэта толькі на першы погляд. І хай у гэтых апавяданнях не да канца выпісаны характар чалавека, не поўнасцю раскрыта тая ці іншая з'ява, але лірычная споведзь пісьменніцы будзіць у чытача высокае патрыятычнае і маральнае пачуццё. У апавяданнях ясна акрэслены аўтарскі пункт гледжання на таго ці іншага героя, чытач падзяляе яе сімпатыі і антыпатыі.

І ўсё ж некаторым апавяданням («Маладошы», «Пацеркі», «Буркі», «Камсамольскі білет», «Сцяг» і іншыя) часам вельмі не хапае «глыбіні дыхання», калі можна так сказаць. У іх шмат няспелага, павярхоўнага, пазбаўленага значнасці замыслу. У зборніку трапляюцца замалёўкі-ўспаміны, якія не робяць гонару пісьменніцы, іх пры належнай патрабавальнасці да сябе можна было б наогул не ўключаць у кнігу. Іншы раз хочацца сказаць аўтару: «Крыху цярпення! Няхай яшчэ паляжыць твор у шуфлядзе. Задума харошая, ды да канца, па-мастацку не выгашана». Бо вядома, што калі за аўтарскім успамінам няма глыбокага роздуму, значных думак, то ён застанецца толькі незакончаным эскізам, за якім не відно сапраўднага твора.

Чытаючы зборнік, можна заўважыць, што пісьменніцы лепш удаюцца апавяданні пра мінулае, пра вайну. Відаць, той жыццёвы матэрыял лепш адстаяўся ў памяці, лепш асэнсаваны. У гэтых апавяданнях больш тонкія і разнабаковыя прыёмы мастацкага даследавання жыцця. Шкада, што гэтага няма ў апавяданнях аб сучаснасці.

У першую кніжку прозы Еўдакія Лось уключыла таксама свае лірычныя занатоўкі «Старына-багатырачка», у якіх яна цёпла, шчыра, з паэтычнай непасрэднасцю расказала аб паездцы ў родную вёску. Пісьменніца была ўражана і ўзрадавана, калі ўбачыла вялікія змены, якія адбыліся ў роднай вёсцы Старыне, у жыцці яе землякоў. Яе таксама глыбока абурылі і некаторыя адмоўныя бакі жыцця. Аб усім гэтым пісьменніца гаворыць адкрыта, нічога не тоячы. Яна намалявала цэлую галерэю па-свойму цікавых, каларытных людзей, нашых сучаснікаў...

Зразумела, можна не згаджацца з той ці іншай ацэнкай празаічнага дэбюту Еўдакіі Лось. Ясна адно, што лепшыя яе апавяданні даюць падставу меркаваць аб ёй, як аб празаіку перспектыўным, які яшчэ парадуе чытача больш значнымі і больш спелымі творамі.

В. КУЦЭНКА.

Еўдакія Лось. «Пацеркі». Апавяданні. Выдавецтва «Беларусь», Мінск, 1966.

Мовай дакументаў

У серыі «Паўстанне 1863 года. Матэрыялы і дакументы», якая выдаецца ў Маскве сумеснымі намаганнямі рускіх, беларускіх, літоўскіх і польскіх вучоных, убачыў свет чарговы том — «Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863—1864 гг.». Побач з раней выдадзеным томам «Рэвалюцыйны ўздым у Літве і Беларусі ў 1861—1862 гг.» ён з'явіцца добрым дапаможнікам для ўсіх тых, хто даследуе гісторыю беларускага народа і беларускай літаратуры мінулага стагоддзя.

У зборніку «Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863—1864 гг.» асаблівую ўвагу беларускага чытача прыцягнуць дакументы, звязаныя з рэвалюцыйнай і публіцыстычнай дзейнасцю Кастуся Каліноўскага. У томе змешчаны тэкст сёмага нумара «Мужыцкай праўды», а таксама «Прыказ ад ронда Польскага над цэлым краем літоўскім і беларускім да народу зямлі літоўскай і беларускай», аўтарам якога, відаць, таксама быў К. Каліноўскі. Вялікую цікавасць маюць матэрыялы — данясенні царскіх жандараў аб знаходках «Мужыцкай праўды». З гэтых данясенняў відаць, што нумары газеты даходзілі да самых аддаленых куткоў беларускай зямлі. У томе прыведзены таксама паказанні Каліноўскага ў Віленскай асобай следчай камісіі, запіска, якую склаў палымяны рэвалюцыянер пасля заканчэння над ім следства.

Асобныя раздзелы зборніка прысвечаны разгортванню рэвалюцыйнага руху на тэрыторыі Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай і Гродзенскай губерняў. Як відаць з дакументаў, толькі па Мінскай губерні ў «мяцяжы» ўдзельнічала да 1600 чалавек. З іх было ўзята ў палон 748 і пакарана смерцю 12 чалавек. Сярод рэпрэсіраваных былі беларускі пісьменнік В. Дунін-Марцінкевіч і яго дачка Каміла. Аб гэтых «дзяржаўных злачынцах» гаворыцца ў змешчаным у томе данясенні выконваючага абавязкі мінскага губернатара Кажэўнікава на імя Казімава.

Складаннем многіх раздзелаў зборніка кіраваў беларускі пісьменнік і гісторык літаратуры Генадзь Кісялёў. Прадмова да тома, які выйшаў у маскоўскім выдавецтве «Наука», дадзена на чатырох мовах — рускай, беларускай, літоўскай і польскай.

Гэта Людміла Клішына і Валянціна Сякерная — работніцы Добрушскага кніжнага магазіна. Ветліва сустракаюць дзяўчаты кожнага пакупніка. Аднаму параяць, другому дапамогуць падабраць патрэбную кнігу, у трэцяга прымуць заказ... І шмат хто ім кажа шчырае дзякуй за старанную працу.

Фота А. СТАРЧАНКОВА.

Выйшлі з друку

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ. Круглы год. Выбранае. 1966 г. Тыраж 8.000 экз., 216 стар. Цана 43 кап.

АЛЕСЬ БАЧЫЛА. Дарыце цюльпаны. Вершы. Мастак Ю. Зайцаў. 1966 г. Тыраж 6.000 экз., 120 стар. Цана 28 кап.

СЯРГЕЙ ГРАХОЎСКІ. Які вялікі дзень. Апавяданні. Мастак Б. Забораў. 1966 г. Тыраж 10.000 экз., 200 стар. Цана 28 кап.

ПАВЕЛ КАВАЛЁЎ. Аповесць пра добрае сэрца. Апавяданні. Гумарэскі. На рускай мове. Мастак М. Бялецкі. 1966 г. Тыраж 100.000 экз., 368 стар. Цана 66 кап.

ІВАН ЛАСКОЎ. Стыхія. Лірыка. На рускай мове. 1966 г. Тыраж 3.500 экз., 80 стар. Цана 15 кап.

ІВАН ШАМЯКІН. Збор твораў у пяці тамах. Том IV. 1966 г. Тыраж 7.600 экз., 688 стар. Цана 31 кап.

ВЫДАВЕЦТВА «НАРОДНАЯ АСВЕТА»

КАНДРАТ КРАПІВА. Дзве п'есы. (Партызаны. Хто смяецца апошнім). Школьная бібліятэка. Мастак Ю. Пучынскі. 1966 г. Тыраж 15.000 экз., 152 стар. Цана 27 кап.

ВЫДАВЕЦТВА «ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА»

БЕЛАРУСКАЯ ВУСНАПАЭТЫЧНАЯ ТВОРЧАСЦЬ. Вучэбны дапаможнік пад агульнай рэдакцыяй праф. М. Р. Ларчанкі для філалагічных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў. 1966 г. Тыраж 4.000 экз., 188 стар. Цана 57 кап.

Паэтычная паверка

Сымон БЛАТУН

■ ■ ■

Я па зрэбным бягу палатне,
Што бяліць разаслала маці
На лузе ля калінавай копанкі...
Гэта ж трэба выткаць такую дарогу!
Я бягу, а ёй краю няма:
Між вусатых жытоў разаслалася—
На бальшак пакаціўся сувой...
Разаслаўся шлях шэраю стужкаю
Праз палеткі, лугі і лясы...
Дык грыміце ж, грамы!
Ліўні колкія, шпарце!
І бяліце дарогу маю,
што выткала маці...

■ ■ ■

На твае залацістыя косы,
Помню, селі два матылькі,
Быццам макі пунсовыя.
Там яны і заблыталі крыльцы,
Пачалі трапятаць, трапятаць...
Доўга так трапяталі яны.
А аднойчы на лузе мядовым
Раптам пырхнулі і паляцелі.
Як шкада! Я пабег наўздагон,
Каб злавіць матылькоў тых
жаданых...
Бег і бег... Раптам бачу—паселі
На льняную галоўку дзяўчынкі,
Што гуляла ля хаты у класы,
Пачалі, як раней, трапятаць...
Падышоў, хацеў зняць іх рукою,
Ды дзяўчынка сказала з дакорам:
— Не чапай, ты вялікі ўжо дзядзя,
Гэта будуць мае матылькі...

МЕДАНОС

Вецер з луга прынёс
Пах духмяны:
То ідзе Меданос—
Хлопец п'яны.

Меданос, Меданос,
Дай ты мёду—
І для пчол і для вос
Асалоду.

Калі хлопец ў хмялі,
Дык шчадрыня:
Да яго і чмялі
Нават рынуць.

Дзесь хавае свой нос
Толькі шэршань.
Меданос, Меданос...
Звон сталёвых кос...
Пра цябе не раскажаш
вершам.

НОЧ

Я—повар ночы.
Бяру я коўш Мядзведзіцы Вялікай
І чэрпаю з азёр ваду.
Яна дажджом цурчыць назад праз
сіта,
І паглядзі, што робіцца ў каўшы!
У медных панцырах санліва карасі
Маленькімі ратамі пазяхаюць,
Шчупак крутнуў акрабатычна
сальта—
Маляўкі пачалі яму пляскаць.
Падлешчык дыхае, нібыта
занядужаў—
Падушку б з кіслародам яму даць.
Ага, і ты, піскявы ўюн, патрапіў!
Віляй, віляй! Ад юшкі не ўвільнеш...
Я—повар ночы.
І саган чумазы
Да белай пены-злосці дапяку.

Дзяркач

Па балотах, імшарах, трысці
Пешшу дыбае ў вырай дзяркач —
У далёкую Афрыку крочыць.
На дзябёлых нагах у яго мазалі,
Асакою парэзаны ногі...
До яму спачуваць!
За плячыма нясе
не слабыя ён крылы—
Імі б толькі па небу сігаць...
Дзеркачу ж тыя крылы ў цяжар.

■ ■ ■

Веру я, што у маці ёсць крылы,
Яна птушкаю можа лятаць,
Ды не той легкадумкай зязюляй,
Што сваіх пагубляла дзяцей.
Шызакрылая кнігаўка — маці,
Яна будзе лятаць у трывозе
І кружыць над зямлёй рызыкоўна,
Ад дзяцей каб адвесці бяду...
Як жа добра было б, каб вось гэткія
крылы
І ў нас выраслі таксама:
Каб да маці заўсёды ляцець.

■ ■ ■

Зямлю спавілі абручы вясёлак —
Арбіты таямнічыя, дзіцячыя.
Па іх даўно лятаюць спадарожнікі
Гарэзных мараў і квяцістых сноў.
Мой карабель па той арбіце
Таксама плыў, аж покуль не згарэў...



ПРАЧЫТАНА БЕЛАРУСКІМ МАСТАКОМ

Андэрсен! Бадай, не кожны казачнік карыстаўся такой папулярнасцю ў ілюстратараў. Шырока вядомыя сатырычна-вострыя, бічуючыя малюнкі чэха Буды. Трошкі празаічнымі стварыў іх балгарскі мастак Ангелушаў. Вясёлыя і дэкаратыўна-прыгожыя ілюстрацыі ў графіка Канашэвіча, трошкі сур'ёзныя і апавядальныя ў Алфееўскага... Доўгі спіс майстроў, якія аддалі даніну вялікаму Андэрсену. Кожны з іх па-свойму прачытаў і праілюстраваў яго. Адны з мастакоў звярталіся да чытачоў сталага ўзросту, другія — да маладога пакалення. Беларускі графік Арлен Кашкурэвіч адрасаваў свае малюнкі толькі дзецям. Гэта ілюстрацыі да казак Андэрсена, якія хутка выйдуць у свет у беларускім выдавецтве «Народная асвета».

...Дыміць, як паравоз, люлька адважнага салдата; з адкрытымі вечкамі стаяць цудоўныя, мудрагеліста распісаныя куфэркі для грошай медных, сярэбраных і залатых; іскрыцца вялізнае сонца, да якога ў «новы свет» вёў пастушку слаўны камінар: вялізныя нажніцы, якіх не бралі ў рукі краўцы-махляры, абцягненыя павуціннем: вычварная кітайская ваза з дарагім завадным салаўём — усё гэта падаецца мастаком дзецям, як свет, які гаворыць, як свет незвычайны, які памагае зразумець казку, яе павучальны сэнс. Малюнкі, цікавыя і дасціпныя, выклікаюць жаданне доўга іх разглядаць, бо яны створаны мастаком з улікам дзіцячага ўзросту.

У кнізе ляцяць цераз радкі гарошыны, падарожнічаюць паміж літарамі мурашкі. Са старонкі на старонку пятляе тэлеграфны кабель — «вялікі марскі змей», а ў першай мышы з казкі «Суп з каўбаснай палачкі» ад старраннасці ў час спявання хвост завярнуўся.... скрыпічным ключом.

Цікавая трактоўка персанажаў. Напрыклад, у «Снежнай каралеве» разбойнікі намаляваны хутчэй як аматары паесці і выпіць, чым змрочнымі рабаўнікамі. Яны не столькі страшныя, колькі смешныя. У «Дзюймовачцы» сляпы крот носіць квадратныя акуляры для важнасці, а дарогу, для надання значнасці сваёй асобе, асвятляе гнілушкаю ў ліхтарыку, які цягае ў роце. У «Старым доме» шмат цікавых старых рэчаў. А судовыя выканаўцы, што нясуць на аўкцыён рэчы, воляю мастака самі пачынаюць нагадваць мэблю, якую выносяць, — такія яны ўрачыста драўляныя. На сярэбранай манетцы, якая не разумела, чаму яе прымаюць за фальшывую, паказаны здзіўлены твар... караля, і дзірка для вяровачкі аказалася — дзякуючы фантазіі мастака — якраз на месцы вока. Маляваныя канцоўкі да казак часта маюць павучальны сэнс. У казцы «Ганс-чурбан» капялюш апошняга апынуўся зверху туфель капрызнай прынцэсы, якая стала яго жонкай.

Цяпер пра тэхніку мастака. Усе яго работы выкананы пяром. Выразна, гранічна ясна і дэкаратыўна чытаецца любы малюнак. Неабходна адзначыць, што ўсе яны вельмі «кніжныя» і цесна звязаны з самой паліграфіяй кнігі. Арлен Міхайлавіч для арнаментаў, рарункаў, упрыгожанняў на суненках у сваіх малюнках шырока выкарыстаў розныя шрыфты і наборныя знакі, што, бясспрэчна, зрабіла малюнкі арыгінальнымі, бо яны неслі функцыю дэкаратыўную, і цесна звязала іх са шрыфтам тэксту.

Праўда, гэты прыём не заўсёды трапляў у цэль. Напрыклад, у казцы «Аб тым, як бура перавесіла шыльды» рукі-ўказальнікі былі перанесены мастаком з пачатку XX стагоддзя ў старажытную казку. Ёсць некаторае змяшчэнне эпох у касцюмах.

Неабходна сказаць пра партрэт Андэрсена. Ім кніга адкрываецца. Андэрсен у мастака разумны і трошкі сумны, з кплівай усмешкай глядзіць ён на каралёў і вяльможаў, што ўцякаюць ад яго. Гэта партрэт чалавека, у якім побач з дзіцячай сардэчнасцю жыў з'едлівы сарказм, непрымірымасць да пошласці, мяшчанства і пратэст супраць сацыяльнай несправядлівасці.

З выхадам гэтага выдання і аматары творчасці Андэрсена, і аматары беларускай графікі атрымліваюць добры падарунак.

Г. БАРЫШАЎ.

У «ЗВЕЗДЕ» — БЕЛАРУСКАЯ ПАЭЗІЯ

У жнівеньскім нумары часопіса «Звезда» апублікавана вялікая падборка вершаў «Паэты Беларусі». Часопіс знаёміць рускага чытача з вершамі Петруся Броўкі, Максіма Танка, Максіма Лужаніна, Пімена Панчанкі, Анатоля Вялюгіна, Міхася Калачынскага, Сяргея Грахоўскага, Аляксея Пысіна, Аляксея Русецкага, Антона Бялевіча, Міколы Аўрамчыка, Аляксея Зарыцкага, Рыгора Барадуліна. Пераклады іх твораў зрабілі рускія паэты А. Пракоф'еў, Ус. Раждзественскі, М. Камісарава, П. Кабзарэўскі і іншыя.

управіўшыся ўхапіць у буфеце на дэбаркадэры кухаль кіслага піва і нейкі леташні бутэрброд — скамянелую скібку булкі і пластмасавую пласцінку сыру. Была і лодка на зарачанскім прыпынку, толькі прыплыла яна з нейкай Бучывёскі, што была недзе за лесам, па другі бок ракі. Прыязджала па настаўніцу. Пра гэта Юльян Іванавіч даведаўся, лёгкадумна выскачыўшы па хісткіх дошках на бераг і перагукаючыся з дзядзькам-лодачнікам. І пакуль удакладняў, адкуль і куды тая лодка, цеплаход адчаліў і зароў-загрукаў пліцамі, набіраючы хуткасць.

— А то паедзем з намі! — крыкнула была з лодкі настаўніца, пажылая жанчына. — І ў нашым калгасе можна здымкі зрабіць.

— Ды не, пачакаю... — зноў лёгкадумна адмовіўся ён.

Колькі разоў потым ён успамінаў тую настаўніцу, колькі разоў лаяў сябе апошнімі словамі! Хоць бы папрасіў яе, каб пазваніла са сваёй вёскі ў той «Чырвоны партызан» — каб адтуль прыслалі па яго лодку, дык і то не даўмеўся...

Ён застаўся адзін, як палец, на пясчанай трохвугольнай выспе, сям-там зарослай лазовымі кустамі ды сасонкамі. Адзін вугал выспы ўпіраўся ў луг ці балота, цяпер залітае вадой, — туды вёў напрасткі ледзь прыкметны след. Сёлета гэтай сцежкай яшчэ ніхто, мусіць, не хадзіў. Недзе там, за гэтым туманным разлівам, і быў калгас «Чырвоны партызан», куды ён ехаў па спецыяльнаму заданню.

Сціхла ўсё на рацэ, яе паступова ўсю зацягнула туманам, растала ў ім, як драбок цукру ў шклянцы з кіпнем, сонца. Зрабілася холадна, золка. Ён усё спадзяваўся, што вось-вось паявіцца лодка, надбадзёрваў сябе, хадзіў кругамі па выспе. У чаравіках непрыемна хлюпала, ногі пачалі стыць. Холад браўся ад іх вышэй, лез да спіны. Між лапатак пабеглі дрыжыкі.

І раптам ён зразумеў, што нічога не выхадзіць, нікога не прычакае. Які гэта дурань, дзеля якой патрэбы папрэцца на ноч гледзячы, на гэты чортаў прыгорак? Цеплаход жа, ведаў, будзе ісці толькі раніцою.

Двойчы спрабаваў ён, спачатку толькі разуўшыся, а другі раз і здзёршы з сябе вузкія штаны, перайсці той разліў ўброд — павінен жа недзе быць канец вадзе. Брыў, як на хадулях, трасучыся ўсім целам і адчуваючы, як заходзіцца ад ледзяной вады сэрца. Часам падэшвы апякаў слізкі лёд — недзе там, на дне, і яму думалася, што такога яшчэ ні разу на даводзілася перажываць, што трэба хоць запомніць добра ўсё гэта, каб потым можна было калі апісаць, успомніць... На нейкім падводным ледзяным схіле ён паслізнуўся і ледзь утрымаўся на нагах. Намачыў рукаў паліто, выпусціў з рук штаны. У двух кроках ад яго нёсся, віраваў паток — можа тут было русла якой рэчкі ці канава? І ён зразумеў, што нічога з яго задумы не выйдзе, нікуды ён не выберацца, трэба, пакуль зусім не нахапілася цемра, вяртацца на выспу, перабыць ноч пры агні.

Але агню развесці не было чым — запалак у кішэні не аказалася. А калі палез па вадзе да напалову залітага паласатага слупа з ліхтаром наверсе, то ўбачыў, што там не ліхтар, а электрычная лямпачка, якая аўтаматычна ўключалася ад батарэі з надыходам змроку.

Юльян Іванавіч ледзь успёр на сябе мокрыя штаны і чаравікі і бегаў па востраве да знямогі, пакуль хоць крыху адышоў. Але варта было спыніцца на хвіліну, як золь і холад прабіралі зноў да касцей. І ён зноў зрываўся з месца, бегаў і бегаў.

Пад раніцу ён зусім знябыўся, блукаў па востраве, нібы п'яны, у нейкай дрымоце-здранцвенні, нават не разумеючы, дзе ён і што з ім...

На світанні пачуў плёск вёсел. Ён кінуўся да берагу і дзіка крычаў у туман, пакуль не пераканаўся, што лодка павярнула да яго. З туману выплыў, як прывід, бакеншчык — невысокі, аброслы рыжай шчэццю стары з пунсовымі шчокамі, убачыў Юльяна Іванавіча і хуценька забожкаў, заспяшаўся да берагу...

Здалося, што лодку нібы тузанулі з-пад ног. Юльян Іванавіч скалануўся, махнуў рукамі, быццам хацеў учапіцца за што-небудзь, і прачнуўся канчаткова.

Расхінуліся шторы, выглянула адтуль галава маладзіцы, бліснулі ўсмешкай зялёныя, нібы лясныя цені, вочы.

— Ой, прабачце... — паказалася яна ўся. — Я й забула, што не прынесла вам адзежу. Я зараз...

Яна збегала на кухню, вярнулася:

— Во... І штаны, і кашуля з гальштукам, і пінжак... Панчошкі... — клала яна на крэсла ягоную вопратку, а ў самой, здавалася, ажно клекатаў, шукаў выйсця смех. — І тапачкі мае абуйце — падыйдуць, я да чаравіка прымервала... Пакуль умоецеся, пад'ясце, то мо і дасохнуць чаравікі... Я іх у печ паклала, на паленцы. Жару там няма, прагарэла ўжо.

— Дзякую, дзякую... Столькі клопату вам нарабіў.

— Ой, які там клопат, Юльян Іванавіч... Ха-ха-ха! Якія вы смешныя былі раніцой — жывому не буць... Сваталіся да мяне...

— Ну-у?! — Юльян Іванавіч сам зарагатаў. Маладзіца, хоць ужо і маці, бянтэжыла яго сваёй непасрэднасцю і шчырасцю. Звонка, узрадавана, нібы дзіця, засмяялася і яна. Вочы яе ўжо свяціліся, як дзве залітыя сонцам лясныя палянкі.

— Прыеду, кажаце, сватацца да цябе, Марыйка... Ой, не вутрываць, жывому не буць... Мой Коля ажно засердаваў на мяне. Раўнівы такі...

— А горшага я нічога не натварыў? Ап'янеў адразу... — яму зрабілася прыкра за сябе, ажно гарачыня хлынула ў твар.

— Ды не! — чмыхнула Марыйка, але тут жа стрымалася, пасур'ёзнела. — Дак вы адзягайцеся, а я пайду абедаць падам. Праспалі абед. Коля прыязджаў на лодцы, думаў забраць вас, дак не дабудзіўся. Бацька тут недзе, на другой завязе вас.

Як толькі за ёй зачыніліся дзверы, Юльян Іванавіч рыўком скінуў з сябе цяжкую ватную коўдру, якой ухуталі яго, каб прапацеў. Вопратка яго была чыстая, папрасаваная, крыху пахла пячным жарам. Ён апранаўся, а ў галаве зноў загучала, нібы і не пераставала, тая дзіўная мелодыя з незразумелымі словамі — «аранжавыя людзі аранжава пяюць». Здаецца, ён пачынаў разумець настрой стваральнікаў песні: бывае такое, дальбог бывае!.. І не толькі з дзецьмі, якім уласціва бачыць і свет, і людзей у ружова-аранжавых колерах...

«І ўсё-такі — што я яшчэ нарабіў?» — зноў даймаў ён сябе пытаннем.

Юльяну Іванавічу цьмяна помнілася, як увялі яго ў хату, як стаяў ён, жаласліва і бездапаможна звесіўшы рукі, як шустрая, рухавая Марыйка, выскачыўшы аднекуль, адразу пачала ўвіхацца каля яго — нібы ўзрадавалася такому незвычайнаму госцю: палівала яму з конаўкі на рукі, але рукі яго не слухаліся, і тады яна сама, сваёй далонькай, мыла ягоны твар, шыю, пасля старанна расцірала яго вышываным ручніком — далікатна, але энергічна. А яшчэ, памятае, ля стала сядзеў цыганаваты хлопец (мабыць, Коля?), зацята курыў і хмурыў бровы. Помніць яшчэ, што яго прымусілі выпіць ледзь не поўную шклянку сібернага першаку, што Марыйка падсоўвала яму сала, вяндліну, масла, вялізны кубак густога, ажно чырвонага чаю, заваранага на маліннiку, і ўсё ўпрошвала: «Будзьце, як дома, ешце, бо, мусі, добра вугаладаліся». Мужчыны — бацька і Коля — сядзелі за сталом таксама, курылі і чакалі: падсілкуецца чалавек, сагрэецца і сам раскажа пра сябе. Але ён ад яды, пітва і цяпла зусім раскіс, што гаварыў — не памятае, пэўна, нешта несусветнае, і яго ўрэшце завялі на канапу...

«Але штосьці яшчэ было... Было!» — не пакідае думка.

Ён зноў паспрабаваў выпытаць у Марыйкі, але — дарма! Гэтая весялуха адно заходзілася ад смеху і круціла галавой са сваімі кудзеркамі над ілбом.

— Можа вам яшчэ гарэлкі? Пахмяліцца? — насмешліва прыжмурвала яна цёплыя вочы. Сама ўселася па другі бок стала, глядзела, як ён есць, і ахвотна расказвала пра сябе, пра сваіх. Пра тое, што яе Коля працуе механікам у тым жа «Чырвоным партызане», ездзіць на работу цяпер у лодцы, а летам на матацыкле: дзесяць кіламетраў адсюль, калі на пароме праз рэчку перабірацца. Пра тое, што пажаніліся яны з год назад. «Раз усяго ўбачыў мяне на кірмашы і ўсватаў. Пакуль плылі цераз Прыпяць у сваты, двух шчупакоў — во-о такенных! — выцягнулі!» Пра тое, што бацьку скора на пенсію, і тады яны перавязуць хату з ракі ў калгас, што яна, Марыйка, будзе там вырошчваць каноплі! — «ой, яны так пахнуць — як хваёвыя лапкі».

Ледзь прычакаўшы, пакуль ён дап'е ўсё той жа малінавы чай, яна пацягнула яго ў спальню паказваць Іванку.

— Бувае, спіць-спіць і як засмяецца ў сне! Аж у грудзях забаліць: так шкада яго зробіцца. І Колю нават так не люблю, як яго...

Юльян Іванавіч хваліў і сына, і маці, гаварыў, што першы раз бачыць такога здаровага і прыгожага малога. Марыйка ўся аж свяцілася.

— Зрабеце нам картачку яго, га? — нясмела, з нечаканай дрыготкай у голасе папрасіла яна. — Мы вам добра заплацім, дальбог... Таго мёду дамо, што вам спадабаўся.

Ён замахаў рукамі: «Што вы, што вы! Якая можа быць плата!» А сам сябе папікаў: «Стары асёл... Не мог сам здагадацца!..»

Пакуль ён хадзіў на кухню па свае прычындалы, пакуль прыладкоўваўся, Марыйка паспела заслаць ложак самай лепшай посцілкай-перабіранкай, пакласці на яе раскручанага ад пялёнак хлопчыка. Пераапранулася і сама. І ён фатаграфаваў голага Іванку на спіне, на жывоціку, на бачку, шчоўкаў яго на руках у Марыйкі і на руках у дзеда, якога яна гукнула з двара, шчоўкаў усіх трох разам...

Праводзячы Юльяна Іванавіча, Марыйка выйшла на ганак. Юльяну Іванавічу запомніліся два вытачаныя, нібы верацёнцы, слупкі-падпоркі, якія падтрымлівалі стрэшку над ганкам. Марыйка ўсміхалася яму на развітанне. У яе ўсмешцы падалося яму нешта жаласлівае. І яго самога працяла вострая туга па нечым такім, што яшчэ не было ім зведана, хоць пражыў на свеце намнога больш, чым гэтая Марыйка ці яе раўнівы муж...

Спусціўшыся па сухой пясчанай сцежцы да самой вады, дзе бразгаў ланцугом, адчэпліваючы ад куста лодку, рыжы бакеншчык — бацька Марыйкі, Юльян Іванавіч яшчэ раз са шкадаваннем азірнуўся на гасцінны домік.

На ганку было пуста.

Наши госці

ПАКАЖА „ЦЫРК ВЕЛЬКІ"

Артысты польскага цырка на Мінскім вакзале.

Фота І. ЗМІТРОВІЧА.

Сёння ў Мінску пачынаюцца гастролі польскага цырка. Карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва» перад прэм'ерай сустрэўся з кіраўніком калектыву Альгердам Каспаракам і задаў яму некалькі пытанняў.

— *Ваша трупа называецца «Цырк велькі». Як узнікла гэта імя?*

— У Польшчы пакуль няма стацыянарнага цырка. З усіх цыркаў Шапіто наш — самы вялікі. Пад яго шатром змяшчаецца больш чатырох тысяч гледачоў. Але цырк вялікі не толькі па памерах. У нас самая вялікая ў краіне трупа (120 чалавек) і — мы, ва ўсякім разе, так лічым — самы цікавы па складзе калектыў.

— *Мінск — адзін з этапаў вашага гастрольнага маршруту?*

— Так. Перад гэтым мы тры тыдні выступалі ў Маскве, а ад вас паедзем у Адэсу.

— *Што ўяўляе сабой праграма «Цырка велькага»?*

— Праграма крыху незвычайная для Польшчы. Справа ў тым, што паказы ў нас, як правіла, носяць дывертысментны, зборны характар. Побач з айчыннымі артыстамі абавязкова выступаюць артысты з-за рубяжа. У сувязі з тысячагоддзем Польшчы і гастролямі па Савецкім Саюзе, мы падрыхтавалі цалкам тэматычную праграму. Яна, як балі ў старыну, пачынаецца з «Паланеза», а заканчваецца... не, не «Мазуркай»... «Падмаскоўнымі вечарамі». Рыхтавалі нашу праграму рэжысёр Мар'ян Манц, харэограф Леакадзія Варманава, мастак Станіслаў Медза-Тамашэўскі, кампазітар Эдвард Гайдэцка. Праграма незвычайная і па жанру. Упершыню ў цыркавым паказе ў нас так многа элементаў эстрады. Нашым дэвізам было: хопіць жахаў, нерваў, напружання, дадзім людзям па-сапраўднаму адпачыць. Мінчане маюць цяпер магчымасць пераканацца, наколькі наша спроба аказалася ўдалай.

— *«Лёгкая» праграма, спадзяёмся, не выключае складаных нумароў?*

— Ні ў якім разе. Справа ў тым, што ў нас выступаюць артысты вельмі высокага класа.

Ян Сіткевіч, «Жалезная рука», як мы яго завём, пасля гастроляў па Савецкім Саюзе, напрыклад, ад'язджае ў Лондан, Парыж і Далас. Крыстына Тэрлікоўска — адзіная ў Польшчы дрэсіроўшчыца львоў. Па-хатняму, проста абыходзіцца яна са сваімі выхаванцамі, і толькі мы ведаем, што ў жыцці гэтай смелай жанчыны быў выпадак, калі са звярамі давялося размаўляць зусім інакш. У вельмі хуткім тэмпе працуе група Кармо. Гэта папулярная ў Польшчы цыркавая сям'я. І, я ўпэўнены, шмат радасці прынясе мінскім гледачам клоун Э. Дваракоўскі — разнастайна таленавіты акцёр, адзін з «кітоў» нашай праграмы. Паказ ідзе тры гадзіны, і, калі меркаваць па прыёме, які аказалі нам масквічы, яны не здадуцца вам доўгімі.

— *Традыцыйнае пытанне: вашы ўражанні ад Мінска?*

— Я быў шмат у якіх гарадах свету. Скажу, што Мінск — адзін з самых прыемных. І гэта не толькі мая думка. Нам будзе вельмі радасна жыць і працаваць тут.

НОВЫЯ ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ

«ЛЕНІНГРАД, ПЛОШЧА РЭВАЛЮЦЫІ»

Горад гэты носіць імя вялікага Леніна. Яго вуліцы і плошчы сваімі назвамі нагадваюць пра цяжкія і гераічныя гады барацьбы за свабоду і шчасце народа. Вось чаму былая Троіцкая плошча названа плошчаю Рэвалюцыі. Тут у адным з дамоў — Музей Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. І калі глядзіш фільм «Ленінград, плошча Рэвалюцыі», нібы ходзіш па залах музея, чытаеш гераічны летапіс.

Фільм «Ленінград, плошча Рэвалюцыі» вытворчасці Ленінградскай кінастудыі навукова-папулярных фільмаў. Аўтар сцэнарыя Ю. Дзмітрыеў, рэжысёр В. Гранатман.

«БОЛДЗІНСКАЯ ВОСЕНЬ (1830 г.)»

Восень 1830 года стала для творчасці Пушкіна незабыўнай. У пачатку верасня Аляксандр Сяргеевіч выехаў у вёску Болдзіна Ніжагародскай губерні, каб прыняць невялікі маёнтак, які застаўся яму ад дзядзькі. Ён ехаў напярэдадні жаніцьбы, ехаў поўны жыццёвага клопату і вялікіх задум, спадзяванняў і трывог. Многае ўжо засталося ззаду: юнацтва, гады апальных вандраванняў на поўдні Расіі, ссылка на Поўнач і снежань 25-га года, гібель сяброў... Надышла сталасць. Эпідэмія халеры затрымлівае вяртанне паэта ў Маскву. Даўно задуманае, перажытае атрымлівае новае жыццё пад пяром паэта. Пушкін піша «Аповесці Бялкіна», «Гісторыю сяла Гарухіна», якая стала летапісам народнага смутку, «Маленькія трагедыі», заканчвае дзевяты і дзесяты раздзелы «Анегіна» і каля трыццаці вершаў.

Пра гэтае геніяльнае паэтычнае жніво і апавядае фільм «Болдзінская восень (1830 г.)», створаны на Маскоўскай кінастудыі навукова-папулярных фільмаў. Сцэнарый напісаны Л. Белакуравым пры ўдзеле доктара філалагічных навук С. Арлова. Рэжысёр Я. Мірымаў.

«СЛОВА ПРА ІГАРА САЎЧАНКУ»

Кінанарыс «Слова пра Ігара Саўчанку» прысвечаны творчай біяграфіі выдатнага ўкраінскага кінарэжысёра Ігара Андрэевіча Саўчанкі. У фільм уключаны ўрыўкі з яго карцін «Гармонік», «Коннікі», «Багдан Хмяльніцкі» і інш. Сваімі ўспамінамі пра І. Саўчанку дзеляцца народныя артысты СССР С. Бандарчук, Л. Віўен, М. Жараў, В. Станіцын, М. Мардвінаў, кінарэжысёры М. Хуцыеў, А. Алаў, В. Навумаў і інш.

Вытворчасць Кіеўскай кінастудыі навукова-папулярных фільмаў. Аўтары сцэнарыя І. Карніенка, Г. Крыкун. Рэжысёр Г. Крыкун.

«МАСТАК ІРАКЛІЙ ГАМРЭКЕЛІ»

Іраклій Ільіч Гамрэкелі пачаў свой шлях тэатральнага мастака на сцэне славутага тэатра імя Руставелі. За дваццаць год ён аформіў 120 спектакляў. Дэкарацыі таленавітага мастака не толькі ўпрыгожвалі сцэну, яны дзейнічалі ў п'есе, стваралі рытм, з'яўляліся адным з вядучых кампанентаў спектакля. Стужка «Мастак Іраклій Гамрэкелі» створана на Грузінскай студыі навукова-папулярных і дакументальных фільмаў. Аўтар сцэнарыя і рэжысёр Рамаз Чыаурэлі.

«НАДЗЕЖДА ПЕТРАВІЧ»

Надзежда Петравіч (1893—1915) — самабытны майстра югаслаўскага жывапісу. Яна вызначыла асноўны напрамак у развіцці сербскага выяўленчага мастацтва першай паловы XX стагоддзя. Яе карціны паружшалі традыцыі, умоўнасць акадэмічнага падыходу да партрэта. Акадэмічную тэхніку яна замяніла непасрэдным успрыняццем, палымяным поглядам мастака. Сербія — яе лясы, рэкі, палі, сады, сяляне на полі, у сябе дома — становіцца галоўнай тэмай Надзежды Петравіч. З імем Петравіч звязана заснаванне першай югаслаўскай мастацкай калоніі, з'яўленне крытычных работ па сучаснаму выяўленчаму мастацтву. «Надзея Югаславіі» — назваў яе скульптар Мештровіч.

Стужка «Надзежда Петравіч» выпушчана студыяй дакументальных фільмаў «Славіяфільм», Югаславія. Аўтары сцэнарыя Д. Амбразіч, Л. Трыфуновіч. Рэжысёр Міадраг Ніколіч.

«ІТАКА»

Воды Іанічнага мора памятаюць многа легенд і паданняў. Востраў Ітака... Гэта тут чакала легендарнага цара Адысея верная Пенелопа пасля яго дваццацігадовай адсутнасці. Імя Адысея стала ўвасабленнем тугі па радзіме, якую адчувае кожны грэк на чужыне.

Тут шмат цікавых помнікаў. Адзін з іх пабудаваны ў гонар Байрана, які загінуў за свабоду Грэцыі. Старыя гарматы — сведкі гераізму астравіцян, якія не раз адбівалі напады ворагаў. Увагу турыстаў прыцягвае музей, у якім сабраны рэдкія экспанаты.

З усім гэтым знаёміць дакументальны фільм «Ітака», створаны грэчаскай студыяй «Перганцыс фільмс». Аператар Тэадарыдзіс.

«ТВАЯ КНІЖКА»

Ці ведаеш ты, як робіцца кніжка?

Фарба і фотаплёнка, метал і папера, дрот і клей, гума і яшчэ многа-многа розных матэрыялаў... Аказваецца, без іх нельга выпусціць нават тоненькую кніжку.

Фільм «Твая кніжка», разлічаны на дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту, апавядае пра найбольш цікавыя моманты стварэння кнігі.

Вытворчасць Ленінградскай кінастудыі навукова-папулярных фільмаў. Аўтар сцэнарыя В. Ткачэнка, рэжысёр І. Зейфман.



Валерый Есіпаў. «Фехтавальшчыкі».
(З дыпломных работ выпускнікоў Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута).

ОПЕРА ПАД ГРУКАТ ТАМ-ТАМАЎ

— Пастарайцеся не прапусціць выступленне нігерыйскага калектыву «Мбары Мбайо». Іх опера «Оба коса» — гэта новае слова ў афрыканскім мастацтве, — гаварыў мне Жак Брэйер, вядомы дзеяч культуры Чорнага кантынента, адзін з ініцыятараў і арганізатараў першага Сусветнага фестывалю афра-негрыцянскага мастацтва ў Дакары. — І хай вас не бянтэжыць няведанне мовы йоруба. Я таксама не разумею ні слова. Але выразная міміка акцёраў, яркая музыка, танцы і выдатныя дэкарацыі ў гэтым спектаклі кампенсуюць няведанне мовы. Сёння ўвечары нігерыйцы даюць апошні спектакль.

Захапляльныя водгукі пра «Оба коса» я чуў і раней. «Опера, музычная камедыя, народны тэатр — па-рознаму называецца гэты зусім новы і арыгінальны мастацкі жанр, які ўзнік у краіне народа йоруба прыкладна трыццаць гадоў назад, а сёння робіцца вядомым усяму свету, — пісаў напярэдадні Дакарскага фестывалю парыжскі часопіс «Афрык». — Адна з пастановак гэтага жанру — опера «Оба коса» мае велізарны поспех».

У гэтым я пераканаўся, калі ў той жа дзень, як і раіў Ж. Брэйер, пайшоў на дакарскі стадыён, дзе выступала нігерыйская трупа.

У аснову сюжэта оперы пакладзен эпізод з гісторыі народа йоруба. Герой оперы — Шанго, оба (правіцель) горада Ойо, сапраўды царстваваў у Нігерыі ў канцы XIV стагоддзя, пра што сведчаць паданні і гістарычныя хронікі, якія пераходзяць з пакалення ў пакаленне, што з'явіліся ў Нігерыі ў канцы мінулага стагоддзя. Вось ад іх і адштурхоўваўся, ствараючы вобраз Обы Шанго, кіраўнік опернага калектыву «Мбары Мбайо» Дура Ладзіпа, у мінулым настаўнік сярэдняй школы, а сёння адзін з найбольш вядомых кампазітараў і драматургаў Нігерыі, аўтар дзесятка папулярных опер. Оба Шанго ў яго трактоўцы — гэта палымяны цэласны чалавек, разумны военачальнік, спрытны палітык, які спрабуе згуртаваць свой народ на барацьбу з суседнімі плямёнамі. Па ходу развіцця п'есы Оба ўступае ў канфлікт са сваімі генераламі, якія імкнуцца перашкодзіць узвышэнню яго. Военачальнікі хочуць прымусіць Шанго адрачыся ад прастола і пакончыць жыццё самагубствам. Аднак у падзеі ўмешваецца народ, які вырашыў заступіцца за правадыра. Разам з нарастаючым гулам шматгалосых там-тамаў спачатку за кулісамі, а потым на сцэне, якая ў апошнім дзеянні з'яўляецца цэнтральнай плошчай Ойо, гучыць голас народнага натоўпу: «Оба коса!» — «Оба не памрэ!»

Асноўнае, чым абавязана опера свайму поспеху і той увазе, якою яна акружана сёння ў Афрыцы, — гэта наватарства яе музыкі. Да нядаўняга часу нігерыйскі музычны тэатр быў звязаны з царквою, якая, выкарыстоўваючы любоў афрыканцаў да паказаў, стварала своеасаблівыя місіянерскія трупы, якія разыгрывалі сцэны на біблейскія сюжэты. У «Оба коса» ўпершыню ў гісторыі нігерыйскага тэатра опера вызвалена ад уплыву царкоўных мелодый. Музыка «Оба коса» цалкам заснавана на старажытнай сістэме гаворачых бубнаў народа йоруба.

Бубны гавораць няспынна. Іх размераны метадычны грукат, зразумелы кожнаму афрыканцу, не перапыняе дыялогі, якія развіваюцца на сцэне, а нібы дапаўняе, узбагачае іх. Усё гэта стварае на дзіва арыгінальны каларыт і настрой, нібы прымушаючы гледача ўжыцца ў своеасаблівы свет сярэдневяковай Афрыкі, што паўстаў перад ім са сцэны.

У значнай ступені гэтаму памагае і цудоўная ігра акцёраў, якіх вызначае сапраўдны прафесіяналізм і сыгранасць. Вельмі своеасаблівыя і ў той жа час рэалістычныя дэкарацыі «Оба коса», створаныя Якабам Афалабі, Руфусам Агундэле і Мураіна Ойеламі — студэнтамі школы мастацтваў пры культурным цэнтры «Мбары Мбайо».

І, вядома, у «Оба коса» здзіўляюць танцы. Афрыканцы нараджаюцца танцорамі, яны вучацца хадзіць і танцаваць адначасова. У танцах адлюстравана афрыканская індывідуальнасць, яны — неад'емная частка жыцця народа Чорнага кантынента. І тым цяжэй у Афрыцы перанесці танец на сцэну, вынесці яго на суд строгага гледача, пазбегнуўшы фальшу і сцэнічнай стылізацыі. Дура Ладзіпа, які з'яўляецца не толькі аўтарам сцэнарыя і музыкі «Оба коса», але і пастаноўшчыкам сваёй оперы, выдатна справіўся з гэтай задачай. Удала ўманціраваныя ў сюжэт оперы народныя танцы вызначаюцца тонкім веданнем малюнка афрыканскай народнай харэаграфіі, выдатна дапаўняюць увесь спектакль.

Паспяхова злучаючы традыцыі афрыканскага народнага мастацтва з магчымасцямі сучаснай сцэны, калектыў «Мбары Мбайо», бясспрэчна, стварыў цікавы і значны спектакль.

С. КУЛІК. (ТАСС).

Нашчадкі Міхайлы Ламаносава

Няма такога адукаванага чалавека, які б не чуў пра геніяльнага рускага вучонага М. В. Ламаносава. Але мала хто ведае пра яго нашчадкаў. А між тым род Ламаносава працягваецца.

Адна з непасрэдных прадаўжальнікаў роду жыве ў Халмагорскім сяле Ламаносава. Гэта Таццяна Аляксандраўна Анціпіна, заслужаная настаўніца РСФСР, нязменны дырэктар Ламаносаўскага музея. Устаноўлена таксама, што нашчадкамі Ламаносавых былі паморскія сем'і Самойлавых, Цітовых, Пекішавых, Архіпавых, Собінавых, Альховых, Шалапанавых, Даронiных, якія вядуць пачатак ад сястры вучонага Марыі Васільеўны.

Пракопій Грыгор'евіч Самойлаў — піцерскі рабочы-рэвалюцыянер — добра ведаў Аляксандра Ульянава. За ўдзел у замаху на цара ён пакутаваў у сібірскай ссылцы. Знайшоўся і Павел Мікалаевіч Самойлаў. Шмат гадоў ён кіраваў калгасам у сяле Верхнія Мацігоры, а ў гады вайны паказаў сябе адважным воінам.

Жыве і род Пекішавых. Яўгеній Пятровіч — інжынер-хімік у Краснадары, Аляксандр — механік рыбалоўнага траўлера, Вячаслаў скончыў Калінінградскае мараходнае вучылішча і плавае, а Мікалай — студэнт Вялікаусцюгскага аўтадарожнага тэхнікума.

АДН.

ЮНЫЯ ІТАЛЬЯНСКІЯ СЯБРЫ

У італьянскім горадзе Фузіньяна паблізу Равены была паказана выстаўка малюнкаў беларускіх дзяцей. Пасля гэтага беларускія дзеці займелі шмат юных сяброў з Італіі. Створана дзіцячая асацыяцыя, якая называецца «Таварыства піянераў — сяброў Беларусі».

Актывісты таварыства «Італія — СССР» арганізоўваюць для піянераў лекцыі і гутаркі па гісторыі Беларусі, расказваюць аб эпізодах партызанскай барацьбы, аб піянерах-героях, аб піянерскай арганізацыі і жыцці беларускіх дзяцей, паказваюць дакументальныя фільмы.

Італьянскія дзеці зрабілі ілюстрацыі да апавяданняў пра беларускіх піянераў. Іх малюнкі выстаўлены ў памяшканні асацыяцыі, дзе таксама экспануюцца фотаздымкі аб нашай рэспубліцы і малюнкі беларускіх дзяцей.

Піянеры і школьнікі Мінска накіравалі сваім італьянскім сябрам піянерскі сцяг, горн, барабаны, дзіцячыя цацкі і лялькі ў беларускіх нацыянальных касцюмах.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

9 верасня

Першая праграма. 10.00 — ваенны парад і дэманстрацыя працоўных, прысвечаныя нацыянальнаму святу Балгарыі — Дню Свабоды. Перадача з Сафіі. 12.30 — канцэрт балгарскага акадэмічнага хору студэнтаў Сафіі (М). 16.45 — праграма перадач. 16.50 — для дзяцей. Балгарскі лялечны фільм (М). 17.00 — першынство свету па валейболу. Перадача з Чэхаславакіі. 19.15 — «Эстафета навін» (М). 20.05 — «Бялявы і галубка». Прэм'ера балгарскага тэлевізійнага мастацкага фільма. Першая серыя (М). 21.00 — вялікі святочны канцэрт. Перадача з Сафіі. У перапынку — «Старонкі паэзіі». Вершы балгарскіх паэтаў (М).

Другая праграма. 19.00 — «Сябры народа». Дакументальны фільм. 19.30 — «Аляксей Крыўчэня». Фільм-канцэрт. 20.45 — тэлевізійныя навіны. 21.05 — «Маё каханне». Мастацкі фільм. Вытворчасць кінастудыі «Савецкая Беларусь».

10 верасня

Першая праграма. 13.55 — праграма перадач. 14.00 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Умелыя рукі» (М). 14.30 — для школьнікаў. «Гары, касцёр, весялей...» (М). 15.50 — тэлевізійныя навіны (М). 16.10 — «Табе, юнацтва!» «Лёшка». Тэлевізійны спектакль (М). 16.40 — «Веды». Навукова-пазнавальная праграма (М). 17.20 — тэлевізійныя навіны. 17.50 — «Тэатр тэлевізійнай навелы». В. Амлінскі. «Музыка на вакзале» (М). 18.50 — «Кірмаш сельскагаспадарчых машын». Рэпартаж з ВДНГ (М). 19.00 — клуб кінападарожнікаў (М). 20.00 — тэлевізійныя навіны (М). 20.30 — «На агеньчык» (М). 21.50 — «Бялявы і галубка». Прэм'ера балгарскага тэлевізійнага мастацкага фільма. Другая серыя. «Грамафон і масліны для маіх сяброў» (М).

Другая праграма. 17.20 — музей мастацтваў народаў Усходу (М). 17.50 — наш кінаглобус. «На вуліцах Вены». Дакументальны фільм. 18.35 — для школьнікаў. «Дзеці капітана Гранта». Мастацкі фільм. 20.00 — «Кацярына». Фільм-опера. 21.30 — мастацкі фільм «Новы нячысты з пекла». Вытворчасць кінастудыі «Талінфільм». Дзецям да 16 год глядзець не дазваляецца.

11 верасня

Першая праграма. У дапамогу завочнікам. (Для І курса тэхнікумаў). 8.15 — «Дэталі машын». Лекцыя другая. 9.00 — музычны антракт. 9.10 — «Тэарэтычная механіка». Лекцыя другая. 9.55 — праграма перадач. 10.00 — для школьнікаў. «Будзільнік» (М). 10.40 — усесаюзны злёт пераможцаў турысцкага паходу камсамольцаў і моладзі па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа. Мітынг-клятва моладзі. Перадача з Краснай плошчы (М). 13.00 — «Ім няма перашкод». Перадача, прысвечаная Дню танкістаў. 13.50 — «Белыя і чорныя». Тэлевізійны шахматна-шашачны клуб. 14.20 — Усесаюзны фестываль самадзейнага мастацтва. Беларускія кампазітары — удзельнікам мастацкай самадзейнасці. 15.00 — «Кірмаш сельскагаспадарчых машын». Рэпартаж з ВДНГ (М). 15.10 — Усесаюзны фестываль самадзейнага мастацтва. Перадача з Львова. 15.50 — «Музычны кіёск» (М). 16.20 — тэлевізійныя навіны (М). 16.30 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Ударная сіла». Тэлевізійны фільм, прысвечаны Дню танкістаў (М). 17.00 — «Спявае Марыо Ланца» (М). 17.40 — «Пеленгатар» (М). 18.10 — тэлевізійны тэатр мініяцюр. «Добры вечар!» (М). 19.00 — заключны канцэрт артыстаў Ташкенцкага тэатра оперы і балета імя А. Навоі. Перадача з Ленінграда. У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 21.30 — «Не ўмешвайся ў шчасце». Мастацкі фільм. Вытворчасць кінастудыі «Лоўчэнфільм». Югаславія. 22.40 — музычная шкатулка. 23.00 — першынство свету па валейболу. Перадача з Чэхаславакіі.

Другая праграма. 13.00 — канцэрт. Перадача з Браціславы. 13.30 — «Другая сустрэча». Дакументальны фільм. 14.20 — для школьнікаў. «Аперацыя «Сірыус-2». Перадача з Ленінграда. 18.00 — для дзяцей. «Буквар». Тэлевізійная пастаноўка. 19.00 — «Творчы партрэт Лідзіі Смірновай». Тэлевізійны фільм. 20.30 — «Другое прызванне». Фільм-канцэрт. 21.30 — «Жаваранак». Мастацкі фільм (М).

Шчаслівай дарогі, тамічы!

У Мінску выступіла канцэртная група з Томска. Праграма гасцей называецца «Тамічы ў дарозе». Яна расказала пра новае жыццё Сібіры, пра яе людзей. Гледачам запомніліся выступленні ансамбля пад кіраўніцтвам Аркадзя Астаф'ева, дасціпныя жарты канферансье В. Шэндара. Цікавай была «Фантазія на тэмы песень аб Сібіры».

На здымку вы бачыце ўдзельніка групы, электрагітарыста Віталія Ушакова.

Фота І. Змітровіча.

ШКОЛЬНЫ КРАЯЗНАЎЧЫ

У Іўеўскім раёне пакуль што няма краязнаўчага музея. Аднак у кожнай школе ствараюцца куткі баявой славы, роднай прыроды.

А ў Князюкоўскай сярэдняй школе створаны амаль цэлы музей. Тут сабрана каля тысячы экспанатаў. Яны размясціліся ў пяці прасторных пакоях.

У першай зале наведвальнікі знаёмяцца з рознымі прыладамі, жыллём, адзеннем, бытам продкаў.

Багатыя матэрыялы прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне. Маляўніча аформлены стэнд «20 год вялікай перамогі», фотамантажы «Яны змагаліся на Гродзеншчыне». Героям-землякам прысвечаны фотамантажы «Удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны», «Яны праславілі Радзіму ў баях, а цяпер у працы».

Настаўнікі, школьнікі вядуць летапіс важнейшых падзей сваёй школы, раёна. Летам у вёсцы Бакшты адбыўся злёт былых партызан, якія дзейнічалі ў раёне Налібоцкай пушчы. Гэтай падзеі прысвечаны спецыяльны фотамантаж «Не згасне слава баявая».

Пастаянна вядзецца летапіс аб родным калгасе «Маладая гвардыя». Яму адведзена цалкам адна зала.

Я. МАКОЎСКІ.

Па той бок

«Крывавая сенсацыя» на Венецыянскай выстаўцы

«Сенсацыяй» гэтага года на Міжнароднай мастацкай выстаўцы ў Венецыі стала «адчувальная камера» японца Ай О.

Ай О — мастак, але яго «адчувальная камера» — гэта не карціна і нават не абстрактнае палатно, зробленае з кавалачкаў абпаленага пластыку або з ануч, накшталт тых, якія, у прыватнасці, дэманструюцца на выстаўцы ў Венецыі. Не, «адчувальная камера» — гэта хвалепадобная сцяна з прасвідраванымі ў ёй адтулінамі і безапеляцыйным запрашэннем: «Сунь у адтуліну палец». З наведвальнікамі, якія адгукаюцца на гэта запрашэнне, адбываюцца самыя дзіўныя рэчы: або пачынае званіць званочак, або яны вымаюць палец, вымазаны сіняй фарбай, або адчуваюць, як палец хапаюць нейкія таямнічыя шчыпцы.

Італьянскія газеты шмат пісалі пра «адчувальную камеру» Ай О. Асабліва ажыўленыя водгукі былі выкліканы ў сувязі з пратэстамі аднаго нямецкага турыста. У дырэкцыі выстаўкі ён расказаў, што, калі ён сунуў палец у адну з адтулін, дык адчуў, як яго ўкалолі некалькі рухомых іголак. Размахваючы акрываўленым пальцам, турыст даволі эмацыянальна выказаў сваю асабістую думку аб «адчувальнай камеры» і аб японскім «мастаку». Каб супакоіць пацярпеўшага, кіраўнікі выстаўкі абяцалі, што яны неадкладна прымуць меры і заткнуць адтуліну. І сапраўды, адтуліну адразу ж заткнулі коркам.

Але ў Венецыі няма недахопу ў абаронцах «свабоды» мастацтва, так што праз гадзіну затычка была вынята. Пасля сутычкі паміж кіраўнікамі выстаўкі і невядомымі прыхільнікамі «адчувальнай камеры» Ай О з усімі яе адтулінамі было прынята рашэнне: адтуліну заляпіць клейкім пластырам і паставіць вартаўніка, які папярэджваў бы наведвальнікаў аб небяспецы. Вядома, цэласнасць «твора мастацтва» была ў выніку парушана, але затое больш няма пагрозы небяспечных уколаў і інфекцый. Значыць, гэта прагрэс, для дасягнення якога, магчыма, спатрэбілася ахвяра невядомага нямецкага турыста, які пайшоў з выстаўкі з акрываўленым пальцам.

У. ГРАКО. (ТАСС).

На захадзе без змен

Гэты год, як і мінулы, зноў характэрны для аўстрыйскіх кінатэатраў наяўнасцю незлічонай колькасці самых розных крымінальных фільмаў. Калі пачытаць анонсы заходнегерманскіх і іншых заходніх пракатных кінафірм, можна падумаць, што ва ўсім свеце толькі і займаюцца тым, што ловяць шпіёнаў і бандытаў. Яны, у сваю чаргу, душаць і забіваюць. Усё гэта робіцца, вядома, у імя «справядлівасці», для барацьбы «за мір, дабрабыт і гонар».

Выбіраючы назвы для кінакарцін, кінапрадпрыемцы не спыняюцца ні перад чым. Вось чытайце, калі ласка: «Як крывяжэрныя звяры», «У сецях блакітнага вампіра», «Я з задавальненнем адпраўляў жанчын на той свет», «Святы з кулямётам», «Чалавек з бомбаю ў роце», «Камісар X — тры зялёныя сабакі» і г. д.

З таго часу, як Джэймс Бонд моцна набіў кішэні ўвішных кінапрадзюсераў, дэтэктывы пачалі з'яўляцца, як грыбы. Публіцы штогод прапануюць дзесяткі падобных твораў «мастацтва», прычым кожны новы фільм як дзве кроплі вады падобны на папярэдні. Мяняецца толькі месца дзеяння. Асобы і метады застаюцца ранейшыя. Адзін або два звышчалавекі з дапамогай сродкаў сучаснай тэхнікі, прыёмаў джыуджытцу і кольта змагаюцца са злачынцамі. Звышчалавекі заўсёды перамагаюць і забіваюць сваіх працiўнікаў, вядома, пры ўмове, што тыя не спатрэбяцца для наступнай серыі крымінальнага фільма.

Аўстрыйскі журналіст Вілі Кубел з трывогай пытаецца ў артыкуле «У крымінальных фільмах Заходу без змен», апублікаваным у газеце «Фольксблат»: Няўжо заходні кінагледач настолькі прымітыўны, каб плаціць за прагляд падобнай кінапрадукцыі?

Л. ТУШАВІН, карэспандэнт ТАСС.

У Паўднёвым В'етнаме ў дапамогу марыянетачнаму рэжыму адпраўлена паўднёвакарэйская дывізія «Белы конь».



На сайгонскі мясакамбінат.

Мал. Ул. ВАРАНОЎСКАГА.

ВЯЛІКІ ПОСПЕХ МАЛЫХ ФОРМ

Культурнае жыццё Прагі немагчыма сабе ўявіць без тэатраў малых форм. Тут выконваюцца невялікія па аб'ёму сатырычныя сцэнкі і папулярныя песенькі.

Самым старым членам гэтай тэатральнай сям'і з'яўляецца тэатр «Ранако». Ён існуе ўжо 13 год. Спачатку ў ім выконваліся сатырычныя п'есы і сцэнкі, а музыка тут была хутчэй своеасаблівым функцыянальным сцэнічным дадаткам. Аднак музычная частка праграмы дасягала ўсё большай выразнасці, расло яе значэнне і ўдасканальвалася выканаўчае майстэрства. Адна з прычын гэтага — з'яўленне на сцэне папулярных спевакоў. Бляск імёнаў Эвы Піларавай, Вальдэмара Матушкі і Карэла Штэдрага, якія пачалі выступаць і як артысты, садзейнічаў павышэнню прыцягальнай сілы «Ранако», асабліва для маладых людзей. Дырэктар тэатра артыст Дарэн Вострцэл не спыніў свой выбар толькі на іх. Ён смела прыняў на работу ў тэатр іншых маладых спевакоў, якія звярнулі на сябе ўвагу або па-за сцэнамі Прагі, або на конкурсах маладых талентаў. У апошнія гады ў гэтым тэатры можна прасачыць за збліжэннем і прарастаннем дзвюх галін — акцёрскай і вакальнай. Прызнання публікі, акрамя вельмі папулярнага Вальдэмара Матушкі, дамагаецца малады спявак і таленавіты акцёр Вацлаў Нецкарж. Пасля таго, як тэатр пакінула Эва Піларава, з'яўляецца таленавітая артыстка Марта Кубішава, якая да гэтага выступала ў невялікім тэатры «Альфа» ў г. Пльзень. Цяпер «Ранако» можа пахваліцца таксама тым, што маладая спявачка Гелена Вандрачкова, якая прыйшла ў тэатр адразу са школьнай парты, атрымала вышэйшую ў галіне папулярнай музыкі ўзнагароду — «Залатога салаўя» за 1965 год. Гэтая ўзнагарода прысуджаецца чэхаславацкім спевакам. На высокім узроўні знаходзіцца і ігра аркестра, мастацкім кіраўніком якога з'яўляецца Вацлаў Гібш. Апрача гэтай групы выступае яшчэ група «Мефісто».

Самым маладым тэатрам малых форм з'яўляецца «Апола», які ўваходзіць у шырокі кангламерат Дзяржаўнай тэатральнай студыі і спецыялізуецца перш за ўсё на выкананні папулярнай музыкі, асабліва песенек. Першая прэм'ера ў тэатры адбылася ў лістападзе 1965 года. Праграма, названая «Прагулка ўдваіх», уключае ў сябе некалькі песень, аб'яднаных свабодным сюжэтнай канвой. Перад тэатрам стала мэта стварэння культываванага віду музычных забаў, у якім упор робіцца на якасць твораў і інтэрпрэтацыі. У гэтых адносінах «Апола» стаіць на вышыні. Членам трупы з'яўляецца пераможца папулярнай анкеты «Каго вы лічыце лепшым чэхаславацкім спеваком» Карэл Гот. Пераможца анкеты становіцца на год уладальнікам «Залатога салаўя». Карэл Гот ужо тры разы запар атрымліваў гэтую ўзнагароду. Апрача яго, выступае менш эфектны, але таксама цудоўны спявак Карэл Гала. Са спявачак пастаянным членам трупы з'яўляецца Івона Пршэнасілава. Членамі трупы таксама акцёры, сярод іх былая актрыса тэатра «Семафор» Паўліна Філіпоўская. Увогуле можна сказаць, што «Апола» вельмі малады тэатр, і ёсць падставы думаць, што яго магчымасці раскрыюцца ў будучым.

Калі «Ранако» і «Апола» з'яўляюцца перш за ўсё тэатрамі інтэрпрэтатараў, дык трэці член гэтай групы — тэатр «Семафор» — аддае сваю сцэну аўтарам. Яго гісторыя, хоць і параўнаўча кароткая («Семафор» узнік у 1959 годзе), але даволі багатая. У ёй можна знайсці і непрызнанне ў першы час існавання тэатра, і, наадварот, галасы, якія выказваюць прызнанне ў перыяд творчай сталасці тэатра. Уклад творцаў «Семафора» Іржы Сухага і Іржы Шлітра значны не толькі ў рамках жанру. Побач са спектаклямі лепарэлаўскага тыпу, складзеных з інсцэніраваных песенек, аб'яднаных суправаджальным тэкстам, тут ставіліся і сатырычна вострыя п'есы «Чалавек з гарышча» і «Такая страта крыві». У 1962 годзе «Семафор» дамогся свайго самага вялікага поспеху, паставіўшы праграму «Іёна і мюзікхол», аўтары якой Сухі і Шлітр (першы з'яўляецца аўтарам тэкстаў, другі — кампазітар) былі адначасова і галоўнымі выканаўцамі. Пазней на гэтай сцэне з'яўляецца новая форма — сольныя праграмы, у якіх маглі цалкам праявіць сябе два-тры салісты.

«Семафор» трымаецца перш за ўсё на творчасці сваіх заснавальнікаў і адначасова лепшых артыстаў Шлітра і Сухага. Цяпер кіраўнікі гэтага тэатра хочуць яшчэ больш падкрэсліць, што «Семафор» — гэта аўтарскі тэатр. Новым членам у цяперашні час невялікай, але калісьці шматлікай трупы стаў акцёр, пісьменнік і інтэлектуал Мірaслаў Горнічак, дасціпны каментатар, які цудоўна адчувае дыханне часу і з'яўляецца аўтарам некаторых праграм. З «Семафора» выйшаў цэлы рад выдатных папулярных спевакоў і спявачак. Варта ўпамянуць, што а р к е с т р «Семафора», якім кіруе саксафаніст і кларнетыст Ф. Гаўлік, адыгрывае значную ролю ў галіне чэхаславацкай джазавай інтэрпрэтацыі.

Культурнае жыццё Прагі, як гэта ўжо было сказана ў самым пачатку, нельга сабе ўявіць без тэатраў малых форм, якія прыцягваюць да сябе неаслабную цікавасць.

Яраслаў ПШЫКРЫЛ. («Навіны музычнага жыцця Прагі»).

Літаратура і мастацтва 4

Пятніца, 9 верасня 1966 года.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».

Індэкс 63856. АТ 01821